ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 54 (1588) | Аўторак, 11 ліпеня 1961 года | Цана 4 кап.

ЧЫТАЙЦЕ НАШАЙ ГАЗЕТЫ:

Ў СЁННЯШНІМ НУМАРЫ —

• Другі Міжнародны кінафестываль пачаўся. **Прывітанне Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова ўдзельнікам фестывалю.** • Лельчыцкі Марэсьеў"—нарыс М. Даніленкі. • **Артыкулы аб Баранавіцкім і Багушэўскім народных тэатрах.** • **Агляд чэрвеньскага нумара часопіса „Полымя":** «На скрыжаваннях ваенных дарог» — аб рамане А. Кулакоўскага. «З блізкае далечы» — пра паэзію ў часопісе. Рэцэнзія А. Семяновіча на п'есу «Любоў, Надзея, Вера...» П. Васілеўскага. Нататкі аб успамінах народнага мастака рэспублікі З. Азгура. • **Рэцэнзію на кінафільм „Апавяданні пра юнацтва".** • Водгук на першы спектакль гродзенскіх артыстаў у Мінску.

СЦЯГ ФЕСТЫВАЛЮ ЎЗНЯТЫ!

Над Манежнай плошчаю сталіцы ўзвіўся ў вышыню вялікі паветраны шар. Здалёк відаць намаляваная на ім эмблема II Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю. У гэтым свяце прагрэсіўнага кінамастацтва ўдзельнічае 51 краіна, а таксама Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, ЮНЕСКА і Дзіцячы фонд ААН. З усіх канцоў зямлі прыехалі дзеячы кіно— артысты, рэжысёры, драматургі, аператары, крытыкі, прадзюсеры. Трыццаць тры мастацкіх поўнаметражных і трыццаць шэсць кароткаметражных фільмаў будуць удзельнічаць у гэтым сусветным аглядзе.

9 ліпеня ў Палацы спорту Цэнтральнага стадыёна імя Леніна адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю.

На адкрыццё фестывалю прыбылі цёпла сустрэтыя прысутнымі таварышы Л. І. Брэжнеў, Ф. Р. Казлоў, А. І. Мікаян, Д. С. Палянскі, К. А. Фурцава, М. С. Хрушчоў, В. В. Грышын, першы сакратар ЦК Балгарскай камуністычнай партыі Т. Жыўкаў, член Палітбюро ЦК і сакратар ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі Д. Марашан, член Палітбюро ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі, першы намеснік старшыні ўрада ВНР А. Апро, член Палітбюро ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі, міністр унутраных спраў ВНР Б. Біску.

Старшыня журы фестывалю савецкі рэжысёр С. Юткевіч сардэчна вітае дзеячоў кінематаграфіі, якія прыбылі на сваё свята.

З прамоваю выступае міністр культуры СССР К. А. Фурцава.

ПРАМОВА К. А. ФУРЦАВАЙ

Дарагія зарубежныя госці! Сябры і таварышы! Дазвольце ад імя Міністэрства культуры СССР, арганізацыйнага камітэта Саюза савецкіх кінематаграфістаў і ад сябе асабіста горача прывітаць удзельнікаў другога Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю і ўсіх прагрэсіўных дзеячоў кінамастацтва, якія сёння ў думках з намі.

Дазвольце таксама выказаць самую шчырую падзяку як гасцям фестывалю, так і ўсім, хто адгукнуўся на наша запрашэнне і знаходзіцца ў гэтай зале.

Маскоўскі кінафестываль, бадай, самы малады сярод іншых міжнародных кінафестываляў. Аднак ён ужо заваяваў прызнанне сусветнай кінематаграфічнай грамадскасці. Пра гэта красамоўна гаворыць факт удзелу ў фестывалі больш чым 50 краін, трох міжнародных арганізацый і прыезд такой вялікай колькасці гасцей, якія прысутнічаюць сёння на адкрыцці фестывалю.

Усяго два гады мінула з моманту, калі адбыўся першы Міжнародны кінафестываль у Маскве, але як многа змянілася ў свеце за гэты кароткі тэрмін.

Кіно — вялікі летапісец часу, і калі дзень за днём прасачыць падзеі і з'явы, адлюстраваныя на плёнцы, дык перад нашым позіркам пройдзе хвалюючая аповесць аб жыцці і лёсе народаў. І я думаю, што выкажу агульную думку, сказаўшы, што галоўным і агульным у жыцці ўсіх народаў было і застаецца імкненне да шчасця і міру на зямлі.

Другі Міжнародны кінафестываль у Маскве праводзіцца ва ўмовах, калі ва ўсіх краінах, на ўсіх мацерыках і кантынентах шырыцца рух супраць новых ваенных пагроз і небяспек. Народы, якія многаму навучыліся на трагічным вопыце мінулых кровапраліцяў, хочуць жыць у абстаноўцы міру і стварэння. Барацьба за мір — гэта загад часу, гэта воля соцень мільёнаў людзей працы.

У гэтыя дні перад усімі дзеячамі мастацтва з новай сілай паўстае пытанне вялікага гуманіста Максіма Горкага: «З кім вы, майстры культуры?»

Сумленне мастака, усведамленне ім сваёй адказнасці перад народам і гісторыяй уладарна патрабуюць, каб мастацтва служыла міру і гуманістычным ідэалам абароны чалавека.

Маскоўскі міжнародны кінафестываль праводзіцца пад дэвізам: «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі!». Ідэі дэвіза фестывалю аб'ядноўваюць прагрэсіўных кінематаграфістаў усяго свету. Адрозненні ў палітычных і творчых поглядах, якія існуюць сярод дзеячоў кіно розных краін, не могуць, не павінны перашкодзіць іх мэтанакіраванай творчасці ў імя міру, дружбы і шчасця народаў.

УДЗЕЛЬНІКАМ МІЖНАРОДНАГА КІНАФЕСТЫВАЛЮ Ў МАСКВЕ

Ад імя Урада Савецкага Саюза і ад сябе асабіста сардэчна вітаю ўдзельнікаў і гасцей другога Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю.

Міжнародны кінафестываль, які адкрываецца ў сталіцы Савецкага Саюза Маскве,—вялікая падзея ў культурным жыцці народаў.

Мастацтва кіно валодае магутнай сілай уздзеяння на сэрцы і розумы людзей. Кожны добры фільм глыбока хвалюе і радуе, знаходзіць жывы водгук у сэрцах мільёнаў гледачоў, дапамагае ім у барацьбе за лепшыя ідэалы чалавецтва.

Гэта асабліва важна ў наш век, калі ўсе сумленныя і мыслячыя людзі аб'ядноўваюць свае намаганні, дабіваючыся, каб ні наша, ні будучыя пакаленні не адчувалі жахаў новай вайны.

Мастацтва кіно можа многае зрабіць для ўмацавання дружбы і ўзаемаразумення паміж народамі, для ўстанаўлення высокіх маральных прынцыпаў. Вось чаму дэвіз Маскоўскага кінафестывалю «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі!» з'яўляецца высакародным дэвізам.

Можна спадзявацца, што Маскоўскі кінафестываль адыграе важную ролю ў далейшым развіцці міжнародных культурных сувязей, у пашырэнні абмену мастацкімі каштоўнасцямі паміж краінамі, у аб'яднанні намаганняў усіх дзеячоў кінамастацтва, у высакароднай справе барацьбы за мір і прагрэс.

Горача жадаю дзеячам кіно новых поспехаў у стварэнні хвалюючых, праўдзівых твораў, прасякнутых імкненнем да міру і шчасця ўсяго чалавецтва.

9 ліпеня 1961 г.

М. ХРУШЧОЎ.

Што датычыць савецкіх кінематаграфістаў і дзеячоў кіно ўсяго сацыялістычнага лагера, дык для іх ідэі гуманізму і міралюбнасці— цвёрдая аснова ўсіх іх творчых пошукаў і намаганняў. Да гэтых высакародных ідэй яны ідуць па закліку сэрца і свайму глыбокаму пераконанню.

Сацыялістычнае кінамастацтва па самой сваёй прыродзе — мастацтва высокага гуманізму.

Сваё высокае прызванне майстры савецкага кінематографа бачаць у служэнні чалавеку, у тым, каб услаўляць яго стваральную працу, раскрываць багаты духоўны свет чалавека, акрыляць яго высакародныя імкненні і палымяна заклікаць у будучыню.

Мы — савецкія людзі — вялікія аптымісты. І гэта зразумела. У таго, хто будуе новае, думкі заўсёды скіраваны ў светлую будучыню. А будучыня нашай краіны, нашага народа—цудоўная! Эканоміка, навука, культура нашай краіны знаходзяцца на вялікім уздыме.

Сёння мы пакажам вам дакументальны фільм «Першы рэйс да зор», які расказвае пра першага ў свеце касманаўта Юрыя Гагарына. У подзвігу гэтага выдатнага чалавека ўвасобіліся дасягненні нашай навукі і тэхнікі, творчая праца вучоных, інжынераў і рабочых.

Вядома, стварыць кінатвор пра чалавека нашых дзён — нашага сучасніка — справа вельмі складаная, але затое якая ганаровая!

Цяжка пераацаніць вялікую ролю кіно, як самага масавага і папулярнага ў народзе мастацтва, і гэта ўскладае вялікую адказнасць на ўсіх дзеячоў кінамастацтва.

Ісці ў нагу з часам, з яго перадавымі ідэямі — вось сапраўднае прызванне сапраўднага мастака!

Ідэі гуманізму, міру і дружбы народаў дарагія нам не толькі як ідэі, якія вызначаюць грамадскі напрамак прагрэсіўнага мастацтва. Яны надаюць самому мастацтву ўнутраную сілу, бо з'яўляюцца здаровай і плённай асновай яго развіцця.

Мэтанакіраванасць, жыццёвая праўдзівасць і мастацкая пераканальнасць — такія асноўныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да сучаснага мастацтва.

Мы спадзяёмся, што і гэтыя і іншыя важнейшыя праблемы развіцця сучаснага кінамастацтва выклічуць вялікую і цікавую размову на дыскусіях, якія будуць праводзіцца ў час фестывалю.

З вялікім задавальненнем мы адзначаем, што побач з дзяржавамі, якія маюць высокаразвітую кінематаграфію і традыцыйна ўдзельнічаюць у міжнародных фестывалях, на нашым фестывалі прадстаўлены многія краіны Афрыкі і Азіі, якія пакуль яшчэ не маюць вялікай кінапрамысловасці, але якая ў іх безумоўна будзе!

Няма ніякага сумнення, што творчая энергія, гістарычны вопыт і нацыянальныя традыцыі народаў гэтых краін паслужаць асновай мастацкай творчасці, і яны скажуць сваё слова ў развіцці кінамастацтва.

Мы спадзяёмся, што дні фестывалю ў Маскве будуць для ўсіх нашых гасцей прыемнымі днямі сяброўскіх сустрэч, дапамогуць лепш пазнаць адзін аднаго і ўзбагаціцца вопытам для новых творчых здзяйсненняў.

Дазвольце мне ад усёй душы яшчэ раз прывітаць удзельнікаў фестывалю, пажадаць фестывалю поўнага поспеху, а кожнаму з вас — новых творчых радасцей, здароўя і шчасця.

Няхай наш фестываль паслужыць далейшаму ўмацаванню культурных сувязей паміж народамі, вялікай справе барацьбы за мір ва ўсім свеце!

* * *

Па даручэнню Савецкага ўрада К. А. Фурцава зачытвае тэкст прывітання ўдзельнікам II Міжнароднага кінафестывалю ў Маскве ад Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова. Гарачымі апладысментамі сустракаюць прысутныя добрыя пажаданні кіраўніка Савецкага ўрада.

Ад імя працоўных сталіцы да ўдзельнікаў фестывалю з прывітальным словам звяртаецца старшыня выканкома Массавета Н. І. Абброўнікаў.

Затым выступае прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі асацыяцый кінапрадзюсераў Артур Уоткінс.

Лаўрэаты I Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю савецкі рэжысёр Сяргей Бандарчук і в'етнамская кінаартыстка Нгок Лан узнімаюць сцяг фестывалю. У святле яркіх праменняў пражэктараў над трыбунамі ўзвіваецца белае палотнішча з фестывальнай эмблемай. Гучыць Дзяржаўны гімн СССР.

І вось гасне святло. Успыхвае экран — пачынаецца паказ новага дакументальнага савецкага фільма «Першы рэйс да зор». З глыбокім хваляваннем і захапленнем глядзяць удзельнікі фестывалю гэты гістарычны дакумент.

Затым была паказана спецыяльная кінапраграма: фільмы «Маленькія галавасцікі шукаюць маму» (Кітайская Народная Рэспубліка), «Музыканты» (Польшча), «Пёс Барбос і незвычайны крос» (СССР), «У суботу ўвечары, у нядзелю раніцаю» (Вялікабрытанія).

Як вялікае свята прагрэсіўнага кінамастацтва, пачаўся Маскоўскі кінафестываль. Яго выдатны дэвіз — «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі!» — знайшоў жывы, шырокі водгук. Экран Маскоўскага фестывалю па праву называюць экранам міру і дружбы.

Магутныя крылы Савецкай дзяржавы

9 ліпеня сталіца нашай Радзімы Масква разам з усёй краінай адзначала Дзень паветранага флоту СССР — свята савецкай авіяцыі, створанай Камуністычнай партыяй, працай і геніем народаў нашай сацыялістычнай Радзімы.

Сёлета гэтае традыцыйнае свята з'явілася яркай дэманстрацыяй новых выдатных дасягненняў нашых лётчыкаў, авіяканструктараў, самалётабудаўнікоў, дасягненняў савецкай тэхнікі і прамысловасці.

...Ярка, з вялікім уздымам, як ніколі раней, праходзіла авіяцыйнае свята ў Маскве.

Зялёная чаша Тушынскага аэрадрома запаўняецца сотнямі тысяч працоўных Масквы, гасцей сталіцы.

Набліжаецца час пачатку парада. Успыхваюць бурныя апладысменты, калі на галоўнай трасе Цэнтральнага аэраклуба СССР імя В. П. Чкалава з'яўляюцца таварышы Л. І. Брэжнеў, Ф. Р. Казлоў, А. І. Мікаян, Д. С. Палянскі, Е. А. Фурцава, М. С. Хрушчоў, В. В. Грышын. Разам з імі на трыбуне — першы сакратар ЦК Балгарскай камуністычнай партыі Т. Жыўкаў, член Палітбюро ЦК сакратар ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі Д. Марашан, член Палітбюро ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі, першы намеснік старшыні ўрада ВНР А. Апро, член Палітбюро ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі, міністр унутраных спраў ВНР Б. Біску, Маршалы Савецкага Саюза і маршалы авіяцыі, адміралы, канструктары па авіяцыйнай тэхніцы, лётчык-касманаўт СССР, Герой Савецкага Саюза маёр Ю. А. Гагарын.

Радыё разносіць сігнал фанфарыстаў: «Слухайце ўсе!» Гучыць велічная мелодыя Гімна Савецкага Саюза. Грымяць раскаты артылерыйскага салюта.

У небе паяўляецца група самалётаў. У чоткім страі яны ўтвараюць на фоне белакіпенных воблакаў і блакіту неба слова: «ЛЕНІН».

19 верталётаў «МІ-1» адкрываюць першае, верталётнае аддзяленне свята. Верталёты нясуць алыя палотнішчы — Дзяржаўны сцяг СССР, сцягі ўсіх саюзных рэспублік.

Радыё абвяшчае аб пачатку другога аддзялення свята—паказу спартыўных і грамадзянскіх самалётаў.

...Пачынаецца трэцяе аддзяленне паветранага парада. Гаспадарамі неба надоўга становяцца парашутысты савецкіх паветрана-дэсантных войск.

Больш 30 хвілін працягвалася ваеннае аддзяленне паветранага свята. І ўвесь час неба, расчэрчанае шлейфамі рознакаляровых дымоў, было запоўнена сучаснымі баявымі самалётамі, якія лётаюць на звышгукавых хуткасцях.

У заключэнне парада лётчыкі робяць своеасаблівы авіяцыйны салют, які яшчэ ні разу не гучаў на Тушынскім аэрадроме.

Дзве гадзіны працягвалася авіяцыйнае свята, галоўным кіраўніком якой быў Галоўны маршал авіяцыі К. А. Вяршынін, а камандуючым парада—маршал авіяцыі С. І. Рудэнка.

У Дзень паветранага флоту СССР—любімага народнага свята мільёны савецкіх людзей зноў і зноў звярталі словы гарачай падзякі да Камуністычнай партыі, якая зрабіла ўсё, каб наша краіна стала вялікай авіяцыйнай дзяржавай.

Лельчыцкі Марэсьеў

У герояў будучых твораў

Няшчасце здарылася раптоўна. Стаяў светлы красавіцкі ранак. Са ссечанай галіны бярозы сцякалі празрыстыя кроплі соку. Цягавітыя мурашкі, шавелячы вусікамі, паўзлі па ствалу, — відаць, хацелася і ім пакаштаваць бярозавіку. Дзесьці ў гушчары лесу азвалася жаўна. У наваколлі стаяла сцішанасць і не верылася, што недзе грыміць вайна, паміраюць людзі. Але сляды вайны былі відаць і тут, у лесе, ля Петрыкава: галіну бярозы зусім нядаўна ссек снарад...

Партызаны ішлі асцярожна. Першым, сціскаючы ў руках аўтамат, Павел Канопліч. Крыху збоку, раз-пораз спыняючыся, пераходзілі ад дрэва да дрэва Рыгор Карповіч і Купрэй Машчыц.

— Дзянёк які! — уздыхнуў Купрэй, што быў бліжэй да Канопліча. — Зямля як пахне, Павел!..

Канопліч нічога не адказаў, толькі нахмурыў бровы і сцяў зубы. Зямля сапраўды пахла вясной, нечым невыказна хвалюючым, што было так вядома яму, трактарысту. Колькі ён там папрацаваў на «ХТЗ» у родным калгасе «Перамога», і насунулася чорная навала. А зараз дзесьці ў баку ад Петрыкава, за Прыпяццю, ужо колькі дзён пагруквае. Камандзір атрада Кажухараў паслаў іх у разведку.

Быццам пярэстая кветка, мільгануў у галлі дуба дзяцел. Ціўкнула берасцянка. Паўлавы вусны кранула пяшчотная ўсмешка: вайна, а птасе гэтай хоць бы што, лятае сабе, гняздо ладкуе. Успомнілася Ірына, вечары, у якія яны любілі хадзіць у лясок, што рос за іхнім Замошшам. Яны слухалі, як перакліканцца берасцянкі, як наладжваюць канцэрты салаўі і... маўчалі. Ім было добра і так удваіх: аб многім яны перагаварылі яшчэ раней, а шчасце—яно не заўжды мнагаслоўнае.

«Іра, Іра, — падумаў Канопліч. — Нядоўга цяпер нам быць у разлуцы. Хутка ўжо ўся Беларусь ад фашысцкай нечысці вызваліцца. Сяду зноў на трактар, і як буду рады, калі ты мне прынясеш абед. Рассцелем шырокі ручнік. Сядзем удваіх. Будзем абедаць і слухаць салаўёў...»

Пад нагамі пашоргвала мінулагодняе дубовае лісце. Аднекуль вецер данёс гаркаваты пах дыму. «Зноў недзе, д'яблы, жыллё палюць», — з горыччу падумаў Канопліч і зірнуў у бок. Постаць Купрэя ўжо знікла ў бліжнім падлеску. Павел зрабіў яшчэ колькі крокаў. Раптам адзін за другім ірванулі магутныя выбухі. Невядомая сіла падкінула Паўла ўгору і затым моцна ўдарыла аб зямлю. Паласнула думка: «Канец! На міну напароўся...» Зямля захісталася ў вачах, у шалёным бегу закружыліся чырвона - зялёныя кругі. І—наступіла доўгае-доўгае забыццё...

Але што гэта? Ён жа ў сваёй хаце. Вось і маятнік старэнькага гадзінніка пастуквае з такім знаёмым іржавым скрыпам. І голас, да болю родны голас, чуецца аднекуль з-за ложка:

— Як жа так, Паўлуша? Што ж гэта?

Павел ірвануўся падняцца, але страшэнны боль пранізаў усё цела, і Канопліч упаў на спіну...

Аб тым, што яму ампуціруюць абедзве нагі, Канопліч зразумеў, калі больш года праляжаў у шпіталях і бальніцах. Пах лякарства стаў яму смяртэльна ненавісным. Чалавек скрыгатаў зубамі, калі ўрачам прыходзілася рабіць яму чарговую перавязку. Таўставаты, сівы хірург, паляпаўшы Паўла па плячу, аднойчы сказаў:

— Нічога, голубе. У народзе кажуць: абы галава была на плячах. А табе пратэзы зробім. Яшчэ танцаваць будзеш.

Канопліч нічога не адказаў. Ад прыроды негаваркі, ён цяпер зусім замкнуўся ў сябе. Яму чамусьці стала ўсё абыякавым: рэз трэба адняць ногі, дык што ж...

У канцы 1945 года Павел вярнуўся ў роднае Замошша.

— Паўлючок, родненькі, — выцірала на вачах слёзы маці. А ён упіраўся ў падатлівы пясок мыліцамі і, здавалася, што гэта ў яго сэрца ўпіваюцца бязлітасныя вострыя стрэмкі. Доўгім, вельмі ж доўгім быў шлях да веснічак роднага двара Канопліча. Некалі ён гойсаў басаногі тут, каля роднай хаты. Адным махам перескокваў парожак веснічкі, каб хутчэй узяць з матчыных рук лусту духмянага хлеба і конаўку халоднага малака. Для маці ён і цяпер быў Паўлючком, як і тады, калі латаншыў суседскія грады ці сады. Прыкусіўшы да крыві вусны, Павел чыкільгаў да ганка. Мыліцы загрукалі па падлозе. І зноў кожны стук болем аддаваўся ў яго сэрцы. Яшчэ большым болем аддаваўся ён у сэрцы матчыным...

Пацягнуліся аднастайныя дні. Гадзінамі Павел ляжаў на ложку, уставіўшы немігаючы позірк у столь. За акном шчабяталі ластаўкі. У сланечніку біліся вераб'і. Кот, павільваючы хвастом, пільнаваў тых вераб'ёў і загадзя аблізваўся. А Канопліч нічога гэтага не бачыў.

— Ты б хоць да людзей выйшаў, сынок, — падышоўшы да Паўла, падала голас маці.

Павел адвярнуўся да сцяны і нічога не адказаў. «Каму я патрэбен такі? — пакутліва думаў ён.— Што мне тая пенсія, калі я — калека без ног. Ірыне на вочы страшна паказацца...»

Ад бярозы, што расла непадалёк ад іхняй хаты, падаў касы цень на табурэт, на ложак. Павел ведаў: цяпер хутка і вечар. А там ноч — пакутлівая, бяссонная. Страшная для яго ноч.

Аднойчы маці нешта вельмі доўга ўходжвалася ля печы. Яна неяк баязліва паглядвала на сына, потым нібы іншым сказала:

— Ірына Рыгорава пра цябе, Паўлючок, пыталася.

Сын умомант павярнуўся да маці.

— А што яна? Не марудзь, кажы, — ажывіўся ён.

Маці разагнулася і ўважліва паглядзела на сына.

— А ты ў клуб ідзі, — параіла яна. — Сёння сход там. Старшыня наказаў, каб ты абавязкова прыйшоў.

— Ат, — расчаравана махнуў рукой Павел.

І ўсё ж у той вечар ён не дачакаўся, пакуль цень ад бярозы зноў дабярэцца да яго ложка. Павел ціхенька ўстаў, паглядзеў у люстэрка, прычасаў ускалмачаныя валасы і накіраваўся ў клуб.

Клуб гудзеў бы той вулей. Старшыня быў рады прыходу Канопліча і сказаў яму, што вырашылі прызначыць яго нарыхтоўшчыкам ягод і грыбоў.

— Будзеш, браце, заўсёды пры жывой справе, — гаварыў ён і нават не захацеў слухаць Паўлавых пярэчанняў. — Нарыхтоўшчык з цябе выйдзе такі, што люба-дорага.

«Люба-дорага» было любімае прыслоўе старшыні. Павел усміхнуўся, успомніўшы, як некалі гэты ж старшыня выгаварваў яму за маленькі агрэх, што выявіў пасля здадзенай Каноплічам узаранай плошчы:

— Не пераарэш, дык так узгрэем, што будзе люба-дорага...

Вядома, тады Павел пераарэў той агрэх. І ніколі больш не рабіў агрэхаў. Перад вайной за добрую работу на трактары ён атрымаў рэспубліканскую прэмію.

Павел вяртаўся дадому і думаў пра старшыню. Харошы ён, душэўны чалавек. Ведае ж, што не работа нарыхтоўшчыка важна для Паўла, а каб на людзях ён часцей бываў. Ох, і хітрун — проста люба-дорага!

Ззаду пачуліся крокі. Яшчэ не азіраючыся, Павел здагадаўся, хто гэта. Сэрца яго трывожна застукала.

— Добры вечар, Паўлуша, — прывіталася Ірына. — Пойдзем разам. Нам жа ў адну дарогу.

Месяц свяціў, і ад частаколаў на вуліцы ляжалі доўгія цені. У адным двары ляніва гаўкнуў сабака і, быццам спалохаўся свайго голасу, змоўк. Павел кідаў непрыкметныя позіркі на Ірыну і здзіўляўся, як змянілася яна. Завастрыўся твар, а пад вачыма віднеліся зморшчынкі.

— Што ж гэта ты, Паўлуша? — ціха загаварыла Ірына. — Нейкім чужым стаў. Мяне пазбягаеш.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Павел Ігнатавіч Канопліч. Фота І. Ламановіча.

СКАРБЫ БІБЛІЯТЭК — НАРОДУ

Пад такім дэвізам у Віцебскай вобласці праходзіць эстафета, арганізаваная абласным упраўленнем культуры і абласной бібліятэкай імя Ул. І. Леніна. Задача эстафеты — шырокі абмен вопытам работы бібліятэк па прапагандзе рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС і выкананню сацыялістычных абавязацельстваў на 1961 год.

Маляўніча афармлены альбом, на старонках якога асвятляецца вопыт бібліятэк, змяшчаюцца фотаздымкі, артыкулы з газет.

30 чэрвеня дэлегацыя бібліятэчных работнікаў Пліскага раёна ўручыла эстафету суседняму Глыбоцкаму раёну. Больш 500 чалавек сабралася ў глядзельнай зале раённага Дома культуры на вечар, прысвечаны перадачы эстафеты.

Вечар нагадваў своеасаблівую справаздачу аб рабоце бібліятэк двух раёнаў па дастойнай сустрэчы XXII з'езда КПСС.

— Рыхтуючы дестойную сустрэчу XXII з'езду КПСС, — сказаў у сваім выступленні загадчык Пліскага раённага аддзела культуры тав. Ананчанка, — бібліятэкі раёна палепшылі работу па абслугоўванню чытачоў. Яны правялі дзевяць канферэнцый чытачоў, 29 тэматычных вечароў, 32 бібліяграфічных агляды. З поспехам прайшоў вечар у калгасе «Беларусь» на тэму «Ад XXI да XXII з'езда КПСС». 45 бібліятэк раёна з 54 давялі кнігу да кожнай калгаснай сям'і, а Хроленская сельская бібліятэка, Бабруйшчынская, Празаранская і Пліская прыклубныя бібліятэкі абслужылі кнігай кожнага жыхара сваёй зоны.

Сумесна з райкомам партыі ў раёне праводзіцца двухмесячнік прапаганды атэістычнай літаратуры.

Загадчыца Глыбоцкай раённай бібліятэкі Н. Нарановіч расказала аб тым, як яны прапагандуюць кнігі, у якіх раскрываюцца велічныя поспехі, дасягнутыя нашай краінай пасля XX з'езда КПСС, як мабілізуюць працоўных на датэрміновае выкананне планаў трэцяга года сямігодкі і пра рэкамендацыю кніг аб перадавым вопыце работнікаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Бібліятэкары раёна імкнуцца да XXII з'езда КПСС зрабіць кожнага калгасніка, рабочага і служачага чытачом бібліятэкі. Для выканання гэтай задачы арганізоўваецца вялікая сетка перасоўных бібліятэк, падворныя абходы. Работнікі раённай бібліятэкі склалі спісы рабочых і служачых, якія не чытаюць бібліятэчных кніг. За тры месяцы яны наведалі 45 прадпрыемстваў з 57 і запісалі ў бібліятэку 156 чытачоў. 21 бібліятэка раёна адкрыла свае фонды чытачам.

Пра вопыт сваёй працы расказалі на вечары загадчыкі Хралянскай і Гаравецкай сельскіх бібліятэк Пліскага раёна тт. Ліс і Кубліцкая, загадчык Чарнянскай, сельскай бібліятэкі Глыбоцкага раёна т. Дзевятоўская, бібліятэкар-актывіст камсамолка Глыбоцкага кансервавага завода Людміла Пашковіч.

Работнікі Глыбоцкай раённай бібліятэкі тт. Атаманчук, Курыловіч, Яноўская афармілі да вечара змястоўную наглядную агітацыю. Чытачы падоўгу затрымліваліся ля стэндаў: «З'езду падарунак — поспехі ў працы», «Рысы незабыўнага вобраза», «Да свету без зброі, да свету без войнаў», «За багацце прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі», «Маякі Глыбоцкага раёна» і інш.

Вечару быў прысвечан спецыяльны нумар насценнай газеты «Голас чытача».

Эстафета «Скарбы бібліятэк — народу» — гэта рапарт бібліятэк вобласці XXII з'езду КПСС.

В. НОТКІНА,
метадыст Віцебскай абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна.

Выстаўка аб Народнай Манголіі

Да 40-годдзя народнай рэвалюцыі і стварэння першага народнага ўрада ў Манголіі ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Ул. І. Леніна наладжана выстаўка, якая адлюстроўвае працоўныя поспехі рэспублікі на слаўным шляху будаўніцтва сацыялізма.

Выстаўлены выдадзеныя ў Савецкім Саюзе кнігі: «Гісторыя Манголскай Народнай Рэспублікі», «Выяўленчае мастацтва МНР», «Сучасны манголскі тэатр» і інш.

Сярод экспанатаў — кніга «Манголскія казкі», якая выйшла ў Дзяржаўным выдавецтве БССР, часопісныя і газетныя артыкулы, прысвечаныя Манголскай Народнай Рэспубліцы.

САМАДЗЕЙНАСЦЬ? ТАК
Але на прафесіянальным узроўні

СВОЕЧАСОВА І СЛУШНА

ДЛЯ ТАГО, каб народныя тэатры трывала ўвайшлі ў быт савецкага чалавека, трэба праяўляць аб іх пастаянны клопат, падтрымліваць і заахвочваць таленавітых аматараў сцэны. Размова з гэтага поваду, якая пачалася на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», мне здаецца вельмі своечасовай.

Мне хочацца спыніцца на такім пытанні: якімі павінны быць нашы спектаклі — платнымі ці бясплатнымі? Цяпер ідуць глядзець спектаклі Баранавіцкага тэатра, папярэдне набыўшы білеты ў касе гарадскога Дома культуры. Ці правільна гэта? Калі мы ставім перад сабою мэту далучыць да тэатральнай культуры шырокія масы людзей, каб яны сталі пастаяннымі жаданымі гасцямі Народнага тэатра, нам, відаць, неабходна адмовіцца ад платных спектакляў.

На сцэне Народнага тэатра іграюць звычайныя аматары, якія не атрымліваюць за гэта зарплату, але тым не менш, увесь запал сваёй душы, усё сваё натхненне ўкладаюць у выкананне любімых роляў. Таму і за нашы спектаклі не варта браць з гледачоў плату, яны павінны іх наведваць па запрашальных білетах.

Многія, напэўна, спытаюць, а на якія сродкі рабіць дэкарацыі і шыць касцюмы да новых пастановак, дзе браць грошы для друкавання афіш і г. д.? Але мы забываем пра тое, што большасць прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў, прафсаюзных арганізацый маюць свае культфонды. Пры адпаведнай дамоўленасці нейкую частку гэтых культфондаў можна было б пералічаць на рахунак Дома культуры, каб Народны тэатр меў свой невялікі бюджэт. Тады патрэба ў платных спектаклях сама па сабе адпадзе і мы будзем выступаць на заводах і фабрыках, у калгасах бясплатна.

І яшчэ адно немалаважнае пытанне.

Рэжысёр Полацкага народнага тэатра А. Галёркін у сваім артыкуле справядліва скардзіцца, што кіраўнікі некаторых прадпрыемстваў, дзе працуюць самадзейныя артысты, недаацэньваюць іх творчасці. Таго, хто працуе ў вячэрнюю змену, неахвотна адпускаюць на рэпетыцыі. Такія ж самыя цяжкасці перажывае і калектыў Баранавіцкага тэатра і нашых артыстаў, якія працуюць на чыгуначным вузле, электрастанцыі, адміністрацыя не хоча адпускаць з работы на рэпетыцыйныя заняткі (а пра выязныя спектаклі і гаварыць няма чаго). Сёй-той з кіраўнікоў прадпрыемстваў «раўнуе», што іх рабочыя ўдзельнічаюць не ў заводскай ці фабрычнай самадзейнасці, а ў Народным тэатры. Было б добра, каб гарвыканкомы прынялі рашэнне аб пераводзе ўсіх артыстаў Народнага тэатра, якія працуюць на прадпрыемствах, на першую змену і стварылі ім нармальныя ўмовы для творчасці.

Цяпер у наш калектыў прыйшло шмат новых удзельнікаў, з якімі трэба працаваць па авалоданню выканаўчай культурай. У працэсе пастаноўкі спектакляў я заўсёды тлумачу сваім выхаванцам важнейшыя элементы акцёрскай ігры. Аднак усяго гэтага недастаткова. І таму пытанне аб студыйных занятках, узнятае А. Галёркіным, зусім слушнае. У гэтым нам абавязаны дапамагчы работнікі прафесіянальнай сцэны.

За апошні час колькасць нашых выездаў са спектаклямі па раёнах вобласці прыкметна скарацілася ў параўнанні з мінулым годам. Па-першае, цяжка бывае дамагчыся ад кіраўнікоў прадпрыемства вызваліць артыстаў тэатра ад працы на час гастролей. А па-другое, дырэктары раённых дамоў культуры больш за ўсё клапоцяцца аб выкананні плана па кінаабслугоўванню, таму не хочуць даваць сцэну для паказу спектакляў Народнага тэатра. Напрыклад, трэці год мы не можам выступіць на сцэне Ляхавіцкага Дома культуры, таму што яго памяшканне культработнікі заўсёды выкарыстоўваюць для дэманстрацыі кінафільмаў. Такое ж прыкладна становішча і ў іншых раённых цэнтрах.

Хацелася б, каб да народных тэатраў ставіліся з большай любоўю і павагай, думалі пра іх будучыню, папулярызавалі іх творчасць сярод шырокіх мас.

М. СЧАНСНОВІЧ,
заслужаны дзеяч культуры БССР, рэжысёр Баранавіцкага народнага тэатра.

Быць тэатру ў Багушэўску!

Багушэўскі раён ліквідавалі, раённы цэнтр пераведзены ў Сянно. Спынілі работу ўстановы, у якіх працавалі члены калектыву Народнага тэатра. Артысты пачалі раз'язджацца, хто куды. Адны ў Сянно, другія ў Віцебск, а некаторыя — на цаліну.

У тэатры засталося не больш пяці чалавек. Перад рэжысёрам Раісай Барысаўнай Сарочкінай узнікла пытанне:

— Быць ці не быць?

Для яе самой жыццё без тэатра нямысліма. З 1929 года ўдзельнічае Раіса Барысаўна ў клубнай самадзейнасці Багушэўска. У 1946 годзе яе, бухгалтара раённай бальніцы, запрасілі ў райком партыі.

— Ці не згадзіліся б вы кіраваць самадзейнасцю ў раённым Доме культуры? У вас ёсць вопыт, а галоўнае — вы энтузіяст гэтай справы.

Раіса Барысаўна згадзілася і неадкладна ўзялася за працу.

У пачатку 1959 года адбылася радасная ў жыцці Багушэўска падзея: драматычнаму калектыву Дома культуры было прысвоена званне Народнага тэатра. Раіса Барысаўна Сарочкіна стала яго рэжысёрам.

За гады напружанай творчай працы артысты маладога тэатра паставілі дзве многаактовыя і тры аднаактовыя п'есы, падрыхтавалі некалькі канцэртных праграм. Жыхары Багушэўска так прывыклі да свайго тэатра, так палюбілі яго, што і ўявіць сабе не маглі, як яны могуць абыходзіцца без яго. Артыстаў пачалі запрашаць у калгасы, у суседнія раённыя цэнтры.

І вось тэатр распаўся. Было ў калектыве каля трыццаці здольных артыстаў, а засталося толькі чацвёра.

Адзін час вырашылі перавесці тэатр у Сянно. Там цяпер усе раённыя арганізацыі. Але чаму Народны тэатр павінен абавязкова знаходзіцца ў раённым цэнтры? Па традыцыі? Але ці добрая гэта традыцыя? Вядома, не! Людзі, якія любяць тэатральнае мастацтва, жывуць усюды — у пасёлках, у вёсках. Усюды ёсць і таленты, няхай сёння яшчэ не выяўленыя. Значыць, практычна Народны тэатр можа існаваць у любым населеным пункце.

Пачаліся пошукі здольных людзей. Знайсці іх спачатку аказалася цяжка. Прайшоў месяц, другі, а тэатр усё не падаваў ніякіх аднак жыцця.

Амаль кожны вечар збіраліся ў Доме культуры прадстаўнікі «старой гвардыі» — артыстка Народнага тэатра шасцідзесяцігадовая Алена Антонаўна Абрамава, выхавацельніца дзіцячага сада Марыя Аляксандраўна Грыцкевіч, рабочы камбіната бытавога абслугоўвання Міхаіл Іванавіч Сакалоў, станочнік дрэваапрацоўчага камбіната Мікалай Сямёнавіч Зайцаў.

Думалі, абмяркоўвалі і, нарэшце, прыйшлі да высновы, што спачатку трэба паставіць не аднаактоўку, а вялікую п'есу з класічнага рэпертуару, але з малой колькасцю дзеючых асоб. Пастаноўка такой п'есы пераканае ўсіх, што Народны тэатр не заняпаў, не рассыпаўся. Выбар прыйшоўся на п'есу «Не ўсё кату масленіца» А. Астроўскага.

Як заўсёды, пры падрыхтоўцы спектакля вялікую дапамогу аказаў тэатру народны артыст БССР Цімафей Мікалаевіч Сяргейчык. У Марыі Грыцкевіч доўга не выходзіла роля Кругловай. Успомнілі, што гэтую ролю калісьці іграла старэйшая артыстка Тэатра імя Якуба Коласа Алена Паўлаўна Радзялоўская. Алена Паўлаўна згадзілася дапамагчы сваім падшэфным, прыжыла ў Багушэўску некалькі дзён. І ў Грыцкевіч справа пайшла на лад.

Спектакль прайшоў з поспехам.

— Тэатр жыве! — узрадаваліся ў Багушэўску. І адусюль пасыпаліся запрашэнні. «Не ўсё кату масленіца» ставілася больш дваццаці разоў. Яе паказвалі ў раённых цэнтрах Лёзна, Гарадок, Бешанковічы, у дванаццаці калгасах розных раёнаў.

І тут адбылося тое, чаго даўно чакалі, на што так спадзяваліся «кадравыя» артысты. У тэатр пачалі прыходзіць людзі.

— Дайце нам ролі, будзем працаваць!

І ўсе, хто сур'ёзна вырашыў працаваць у тэатры, — інструктар Дома піянераў Раіса Фядура, дэмабілізаваны салдат Аляксандр Пазднякоў, камсорг саўгаса Анатоль Гарбачоў, аграном Ларыса Нахмановіч, рабочы Вадзім Краеў, лабарантка бальніцы Раіса Пучкова, фельчар Віктар Лаўчыноўскі — усе яны пагаджаліся, што спачатку трэба папрацаваць на эпюдах, атрымаць хоць бы першапачатковыя звесткі аб акцёрскім майстэрстве, а потым ужо паспрабаваць сябе на маленькіх ролях. І толькі пасля таго можна паспрабаваць сыграць вялікую ролю.

Цяпер Народны тэатр у пасёлку Багушэўску знаходзіцца на ўздыме. Пасля спектакля «Не ўсё кату масленіца» пастаўлена яшчэ некалькі п'ес з вялікай колькасцю ўдзельнікаў. Рыхтуецца да пастаноўкі «Кухарка» А. Сафронава і паралельна — «Дзяўчына з вяснушкамі» А. Успенскага.

— У нас, — гаворыць Раіса Барысаўна, — дрэнна з беларускім рэпертуарам. А наш глядач вельмі любіць глядзець п'есы беларускіх драматургаў. Але ўсе значныя п'есы на беларускай мове мы паставілі. Тыя, што ўключаны ў рэпертуар Віцебскага тэатра, ставіць нам наўрад ці варта, бо тэатр часта бывае на гастролях у нашым раёне. А новых п'ес нам не прысылаюць.

* * *

Артысты Багушэўскага тэатра — сапраўдныя энтузіясты. Яны вельмі любяць ездзіць па калгасах, часта забіраюцца ў самую глыбіню.

Цяпер ужо ніхто не сумняваецца ў тым, што Народны тэатр у Багушэўску, які вытрымаў цяжкія выпрабаванні, будзе жыць. Але што таіцца, быў час, калі раённае начальства пагаварвала аб тым, што адзіны спосаб выратаваць тэатр — гэта перавесці яго ў Сянно. І цяпер яшчэ сёй-той у раённым аддзеле культуры мяркуе, што тэатру ў пасёлку не месца; няхай, маўляў, ён будзе ў раённым цэнтры. Такую думку выказвае, напрыклад, інспектар аддзела культуры З. Сяргеева. Але большасць прытрымліваецца іншай думкі. Сакратар райкома партыі Аляксандр Мацвеевіч Жураўлёў сказаў:

— Існаванне тэатра ў Багушэўску зусім апраўдана. Мы дапамагалі і будзем дапамагаць гэтаму тэатру. Ён вельмі патрэбен раёну і ў першую чаргу — калгаснікам.

Ян НЯМІГА.



Творы пісьменнікаў Савецкай Беларусі часта перакладаюцца на мовы братніх рэспублік і краін народнай дэмакратыі. На здымку вокладкі кніг: «Дрыгва» Я. Коласа на кітайскай мове, зборніка вершаў Я. Коласа на мангольскай мове, «Апавяданні» М. Лынькова на рускай мове.

Лельчыцкі Марэсьеў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Павел прытуліўся спіной да клёна, што рос на вуліцы.

— Ох, цяжка мне, — вырвалася ў яго.—Калі б ты ведала, як мне цяжка!

— Дурненькі. А мне хіба лёгка глядзець, як ты пакутуеш, як ад мяне ўцякаеш?..

— Не будзем пра гэта, — адвярнуўся Павел ад дзяўчыны. — У цябе — жыццё наперадзе. Ты чалавека знойдзеш. Не такога, як я...—апошнія словы ён сказаў пасля доўгага маўчання.

Ірыніны вочы заблішчэлі гневам.

— Як табе не сорамна так гаварыць, так думаць пра мяне? — хвалюючыся, загаварыла яна. — Як ты пасмеў такое падумаць?

Павел маўчаў, пагладжваў рукой халаднаватую кару клёна.

— Даруй, Іра, — прашаптаў ён. — Забудзем на гэтыя словы, любая... Даруй.

Потым яны пажаніліся. Калгас дапамог пабудаваць дом. А калі спраўлялі наваселле, старшыня ўсё пакручваў галавой ды прыгаварваў:

— Домік нішто сабе, люба-дорага.

Пайшла на працу ў калгас жонка. Паявіліся дзеці. Павел працаваў нарыхтоўшчыкам, атрымліваў пенсію. Ды не такой работы рагла яго няўрымслівае сэрца, не такі быў у яго характар, каб ездзіць па вёсках ды збіраць сушаныя грыбы ці ягады. Не-не ды прыйдзе цішком Павел Ігнатавіч да трактара, дакранецца да яго нагрэтага матора рукой, надоўга задумаецца.

— А ты паспрабуй, Павел Ігнатавіч, — сказаў неяк брыгадзір трактарнай брыгады Іван Флёрка. — Паспрабуй.

— Выйдзе! Вось убачыш, выйдзе, — падаў голас і трактарыст Уладзімір Багдановіч.

Павел тады нічога не адказаў. «А што ты думаеш? — запала ў яго душу думка. — На пратэзах жа хадзіць ужо навучыўся. А калі сапраўды паспрабаваць?...»

Цяпер Канопліч ледзь не кожны дзень прыходзіў да Уладзіміра Багдановіча. Часта сядзеў поруч з трактарыстам у кабіне і з радасцю ўслухоўваўся, як роўна білася сэрца машыны. Хвалююча пахла зямля. Якраз так, як у той памятны красавіцкі ранак ля Петрыкава.

Неяк вясной 1948 года Багдановіч спыніў свой трактар каля дома Канопліча.

— Павел Ігнатавіч! — паклікаў ён. — Едзем!

Па свежых барознах спаважна шпацыравалі гракі. У вышыні неба звінелі жаваранкі. Павел Ігнатавіч прыжмурыў вочы і задуменна ўсміхаўся. Уладзімір паглядзеў на яго і сказаў:

— Давай!

І вось яна пралягла, першая баразна Канопліча. Павел крануў рычагі. І тут здарылася непапраўнае: матор заглух. Пакуль машына стаяла на месцы, пратэзы слухаліся чалавека, а цяпер ён не мог імі перадаць свае волі машыне.

Ссутуліўшы плечы, Павел Ігнатавіч ціха вяртаўся па полі да вёскі. «Усё. Апошняя надзея страчана, — стукала ў скронях. — Ні на што я не здатны...»

Уладзімір Багдановіч праводзіў позіркам згорбленую постаць Канопліча, пакуль тая не схавалася за пагоркам.

Ірына Рыгораўна адразу зразумела, што дома здарылася бяда: на стале ляжалі надкусаныя гуркі, стаяла шклянка з недапітай гарэлкай. Павел ляжаў, адвярнуўшыся да сцяны. Плечы яго ўздрыгвалі.

— Што з табою, Паўлуша? — нахілілася да яго Ірына.

Муж прыўзняў галаву і глянуў мутнымі вачыма на Ірыну.

— Не магу я так жыць! — быццам стогн, вырвалася ў яго. — Не магу!

Ірына ціха дакранулася да Паўлавага пляча, супакоіла:

— Усё будзе добра, Паўлуша. Вось убачыш: ты яшчэ сядзеш на трактар. Мы яшчэ з табой не аднаго салаўя паслухаем.

— Сядзеш на трактар, — праз сціснутыя зубы працадзіў Канопліч. — Я садзіўся ўжо. Не слухаецца ён мяне, бязногага...

— Змоўкні! — прыкрыкнула на мужа Ірына. — Кажу: сядзеш на трактар...

У гэты час у дом зайшоў Уладзімір Багдановіч. Пыл пабяліў яго чупрыну, нават вейкі прыпудрыў.

— А ты чаго? — злосна сустрэў яго Канопліч — Суцяшаць?

— Не, не суцяшаць, — нахмурыўся Уладзімір. — Не чакаў, Павел, што ты такі слабак, — і Багдановіч паказаў на парожнюю бутэльку, што валялася на табурэце. — Не такі ў цябе характар, каб схібіць перад цяжкасцямі. Не веру я, што ты адступішся зд свайго. Не веру! Чытаў я нядаўна пра аднаго нашага лётчыка, Марэсьеў яго прозвішча. Не ў такім няшчасці выстаяў. А ты...

— Што ж гэта за лётчык, Валодзя? — сеўшы на ложак, запытаўся Канопліч. — Ці нельга мне тую кніжку пачытаць.

— Чаму ж не? Вось прынясу і пачытаеш.

На наступны дзень Павел Ігнатавіч чытаў кнігу пра савецкага лётчыка і ўжо дзівіўся сваёй часовай слабасці. Што ж з таго, што з першага разу не атрымалася. Чаму ён думаў, што павінна было выйсці адразу? Атрымаецца з трэцяга, сёмага, дваццатага. У яго павінна хапіць вытрымкі, настойлівасці і характару, каб працаваць на трактары. Працаваць так, як працуе Уладзімір Багдановіч. Вакол жа — такія цудоўныя сябры. Адна Ірыніна падтрымка чаго варта.

Вясной 1949 года пасля шматлікіх настойлівых спроб Павел Ігнатавіч Канопліч зноў сеў на гусенічны трактар «НАЦІ». Паварот рычагоў, і машына плаўна зрушылася з месца. З-пад лемяхоў адваліліся скібы тлустай зямлі. Наперад і наперад ішоў трактар. І ўсё шырылася і шырылася ўзараная паласа. І ўсё радасней білася Паўлава сэрца: машына цудоўна слухалася чалавека. Чалавек быў у страі, чалавек перамог, таму што ў яго быў наш, нязломны савецкі характар, таму што ён адчуваў на кожным кроку падтрымку сяброў.

...З таго часу мінула 12 год. Павел Ігнатавіч Канопліч усе гэтыя гады працуе трактарыстам. Ён — лепшы трактарыст саўгаса «Буйнавічы». На трактары «Уладзіміравец» Канопліч працуе на павышаных скорасцях. Цяпер Уладзіміру Багдановічу часам даводзіцца падпаіскаць, каб не адстаць ад Паўла Ігнатавіча. У раёне Канопліча з любоўю называюць «наш лельчыцкі Марэсьеў».

Праз год Павел Ігнатавіч адзначыць сваё пяцідзесяцігоддзе. У яго — вялікая, дружная сям'я. Старэйшая пятнаццацігадовая дачка Анюта пасля заканчэння сямігодкі пайшла працаваць даяркай.

— Мы, татка, таксама будзем стараццa працаваць на павышаных скорасцях, — жартуе яна.

...Ветрык ласкава абвявае твар, халодзіць грудзі. Над шырокімі калгаснымі палеткамі, быццам на нябачных нітачках, павіслі і пяюць жаваранкі.

Павел Ігнатавіч падганяе трактар пад шатрастую сасну, што высіцца на ўскрайку поля, і прыглушае матор. Яшчэ здалёк ён бачыць жаночую постаць у белай кофтачцы. Ірына, як і заўсёды, дакладная: вячэру і абед яна прыносіць у адзін і той жа час. Жонка яшчэ здалёк махае рукой, радасна ўсміхаецца.

Яна падыходзіць, моўчкі рассцілае на мурожнай траве ручнік з вышытымі пеўнікамі і расстаўляе гаршчочкі і талеркі. Павел Ігнатавіч адкройвае ладную лусту хлеба і бярэ лыжку. Раптам ён прыслухоўваецца. У бліжнім алешніку, спрабуючы перад вечарам голас, пачуўся салаўіны пошчак. На хвіліну змоўк. А потым узяў такую ноту, нібы вядомы спявак Вялікага тэатра. Канопліч глядзіць у ласкавыя жончыны вочы і гаворыць:

— Салавей, Ірына.

— Салавей, Паўлуша, — усміхаецца жонка і дакранаецца кончыкамі пальцаў да сярэбраных ніцяў на скронях мужа. Многа іх з'явілася за апошнія гады.

Міхась ДАНІЛЕНКА.

ГУРТКІ ЗРАБІЦЬ ШКОЛАМІ

Не ў кожнай сярэдняй школе працуе выкладчыкам спеваў настаўнік з музычнай адукацыяй. А ў сямігадовых школах, як правіла, гэты прадмет даецца настаўнікам у «дагрузку». І не дзіўна, што юнак, атрымаўшы атэстат сталасці або пасведчанне за 7 класаў, не ведае ні адной ноты. А, між тым, колькі выдаткоўваецца дзяржаўных сродкаў на выкладанне спеваў у школе!

У чым жа справа? У калгасах, саўгасах і раённых аддзелах культуры мала клапоцяцца аб музычнай адукацыі на вёсцы. Нават і там, дзе ёсць магчымасць арганізаваць гэтую справу.

Характэрным з'яўляецца Навамышскі музычны гурток. Трэба адразу агаварыцца, што за гэтай сціплай назвай «гурток» стаіць сапраўдная музычная школа, у трох класах якой навучаецца 63 чалавекі. Ёсць сваё памяшканне са спецыяльна абсталяванымі класамі, піяніна, баяны. Навучанне вядзецца па праграмах музычнай школы. «Гурток» выступае з канцэртамі не толькі ў сваім калгасе, але і ў іншых калгасах раёна, а таксама выязджае ў суседні, Гарадзішчанскі раён. І ўсюды ён мае вялікі поспех.

Гурток дасягнуў добрых вынікаў. І ўсё гэта дзякуючы энтузіязму выкладчыкаў В. Міхальцэвіча, А. Бажкова, І. Дыдэнкі, М. Барбарчыка.

Але гэта гурток. А раз гурток, то нікому ніякай справы да яго няма. Ён не інспектуецца, яму не дасылаюцца метадычная літаратура і наглядныя дапаможнікі, не аказваецца метадычная дапамога, калі не лічыць, што ў час экзаменаў сюды прыязджае прадстаўнік з Баранавіцкай музычнай школы. А ці правільна гэта? На маю думку, над такімі музычнымі гурткамі павінны ўзяць апеку раённыя і абласныя аддзелы культуры і аказваць ім такую ж увагу, як і музычным школам. Па-другое, з такіх гурткоў трэба ствараць калгасныя музычныя школы, калі ёсць база і выкладчыкі з адпаведнай музычнай адукацыяй. І калі яшчэ рана адкрываць дзяржаўныя музычныя школы, то калгасныя, а тым болей міжкалгасныя—можна і трэба. Музычныя школы ёсць у Брэсце, Пінску, Бярозе, Кобрыне, Баранавічах. Але ўсе яны, у асноўным, для дзяцей горада. Пра дзяцей жа сельскай мясцовасці мусяць клапаціцца самі калгасы і саўгасы, а апроч іх — і раённыя, і абласныя аддзелы культуры. Там, дзе ёсць база, дзе калгасы або саўгасы эканамічна моцныя, дзе ёсць выкладчыкі, трэба адкрываць калгасныя або саўгасныя музычныя школы. Калі аднаму калгасу або саўгасу не пад сілу адкрыць такую школу, можна адкрываць міжкалгасныя. Чаму, напрыклад, не адкрыць такую міжкалгасную школу ў Новай Мышы, якая знаходзіцца ў цэнтры двух саўгасаў і аднаго калгаса? Кожны саўгас і калгас пашле сваіх дзяцей у школу прапарцыянальна суме, унесенай з свайго культфонду. А як жа яны будуць наведваць школу, калі жывуць за 10—15 кіламетраў? Вельмі проста. У Новай Мышы пры сярэдняй школе ёсць інтэрнат. Яны будуць тут жыць, вучыцца ў агульнаадукацыйнай школе, а заадно і ў музычнай. А як жа з дзецьмі служачых, бацькі якіх не з'яўляюцца членамі калгасаў або рабочымі саўгасаў? З іх можна браць павышаную плату за навучанне ў такой музычнай школе.

Магчымы і яшчэ адзін варыянт, калі частку выдаткаў возьмуць на сябе бацькі, частку калгасы, саўгасы, а невялікую частку дзяржава.

Варыянтаў адкрыцця музычных школ на вёсцы шмат. Дзе-нідзе ёсць для такіх школ база, умовы і жадаючыя вучыцца. Трэба толькі ініцыятыва і жаданне.

В. ЦЫБУЛЬКА.

СПРАВЫ ПОЙДУЦЬ НА ЛАД

● 7-га красавіка г. г. у нашай газеце быў надрукаваны артыкул І. Мяцько «Злачынства без пакарання». У ім расказвалася пра брудныя справы маладзечанскіх сектантаў.

Загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Маладзечанскага гаркома партыі Д. Юракоў паведаміў рэдакцыі, што цяпер у раёне палепшылася работа па выкрыццю сектанцкай маралі. Галоўная ўвага аддаецца індывідуальнай рабоце сярод веруючых.

У выніку актыўнай антырэлігійнай прапаганды, у раёне спыніўся рост сект. Былая гарадзілаўская абшчына сектантаў распалася, а красоўшчынская секта распушчана. У былым малітоўным доме ў вёсцы Красоўшчына нядаўна адкрыта сельская бібліятэка і медыцынскі пункт.

Гарком партыі сёлета выпусціў плакат «Грамадскасць выкрывае сектантаў».

● К. Юрась напісаў у нашу газету аб тым, як лёгкадумна ставіцца Крывіцкі раённы аддзел культуры да падбору і расстаноўкі кадраў культасветработнікаў. Часта ва ўстановы культуры раёна трапляюць выпадковыя людзі. Пра ўсё гэта расказвалася ў карэспандэнцыі «Затычка пустой бочкі», якая была надрукавана 19 мая г. г.

Загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Крывіцкага райкома партыі тав. Панцялееў паведаміў рэдакцыі, што факты, пададзеныя ў карэспандэнцыі, адпавядаюць сапраўднасці. Дырэктар Будслаўскага сельскага клуба П. Ісачанка ад работы вызвален. Прыняты меры па паляпшэнню справы падбору і расстаноўкі кадраў культасветработнікаў у раёне.

Падзеі. Факты. Навіны

НОВЫ АДДЗЕЛ МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ

У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР створан аддзел прыкладнога мастацтва. Сабрана каля тысячы розных твораў, частка якіх ужо ўведзена ў экспазіцыю.

Сярод іх экспанаты, якія характарызуюць дарэвалюцыйнае рускае мастацтва — фарфор, шкло, мэбля. У ліку атрыманых выраб — ваза рубінавага шкла пецярбургскага завода. Яна выраблена ў першай палавіне XIX стагоддзя. Паступілі раннія па часу выпуску вырабы старых рускіх фарфоравых заводаў, калекцыя рускай лакавай мініяцюры XIX стагоддзя.

Ёсць узоры фарфору, тканін, керамікі, разьбы па дрэву і косці, выкананыя рукамі ўмелых майстроў Кітая, Японіі і Індыі. Іх перадаў Беларускаму музею са сваіх сховішчаў Маскоўскі музей Усходніх культур.

Беларускае мастацтва, у прыватнасці, прадстаўлена ткацтвам, разьбой па дрэву, керамікай. Паступаюць узоры прадукцыі вядомых шклозаводаў «Нёман» і імя Дзяржынскага, Мінскага фарфорафаянсавага завода, майстэрань Мастацкага фонду. Рад рэчаў перадаецца з выставак, на якіх дэманструюцца апошнія работы майстроў.

У бліжэйшы час музей правядзе ў рэспубліцы навуковую экспедыцыю для збірання твораў старажытна-беларускага мастацтва.

КАЛІ КРАВЕЦ ПЯЧЭ ПІРАГІ

З Веткаўскага раёна ў рэдакцыю паступіла пісьмо, у якім паведамлялася пра сур'ёзныя недахопы ў рабоце раённага аддзела культуры і яго загадчыка П. Бабіча. У ім гаварылася пра тое, што П. Бабіч вельмі грубы з падначаленымі, што метады яго кіраўніцтва — голае адміністраванне. П. Бабіч толькі і ведае, што звальняе сваіх работнікаў і накладвае на іх спагнанні. На працягу апошняга года ў раёне змянілася многа кінамеханікаў, бібліятэкараў, загадчыкаў клубаў. Прычым, П. Бабіч зусім не лічыцца з мясцовым прафсаюзным камітэтам і загады аб звальненні падпісвае самачынна.

Нямнога часу спатрэбілася, каб пераканацца ў праўдзівасці гэтых фактаў, хоць загадчык аддзела і спрабаваў іх адмаўляць. Сапраўды, кніга загадаў аддзела культуры стракаціць словамі «звольніць», «вызваліць», «аб'явіць суровую вымову». Пачынаеш цікавіцца кожным фактам звальнення і пераконваешся, што большасць з іх неабгрунтаваныя, тым больш, што на месца вызваленых людзей ставіліся работнікі значна слабейшыя. Старшыня мясцкома прафсаюза работнікаў культуры, загадчыца чытальнай залы раённай бібліятэкі В. Пісарык ні ў чым не пярэчыць П. Бабічу, бо той, чаго добрага, можа напісаць загад і на яе.

П. Бабіч быў вымушаны прызнаць, што ўказаныя ў пісьме факты правільныя. Але загадчык аддзела матываваў свае дзеянні тым, што сярод загадчыкаў клубаў, бібліятэкараў і асабліва кінамеханікаў шмат людзей выпадковых, якія не маюць ні вопыту работы, ні адпаведнай адукацыі, што сярод іх нямала людзей недысцыплінаваных, п'яніц і дэбашыраў.

Запалохванне, пагрозы і нецэнзуршчына — непрыгодны метад кіраўніцтва ні на якім участку работы, тым больш на ўчастку культуры. Аддзел культуры павінен узначальваць усё культурнае жыццё ў раёне, і раптам аказваецца, што загадчык аддзела, чый кабінет знаходзіцца на першым паверсе Веткаўскага райкома партыі, лае па тэлефоне сваіх падначаленых такімі адборнымі мацюкамі, што работнікі райкома толькі моршчацца і спяшаюцца хутчэй прайсці міма кабінета.

У таго ж П. Бабіча намеснікам па кіно з'яўляецца тав. Кісялёў. Гэта—па агульнаму прызнанню работнікаў культуры — п'яніца. Партыя заклікала нас да рашучай барацьбы з п'янствам. Прызначэнне такога чалавека на кіраўніцтва ў органы культуры здаецца проста парадоксам. Тым не менш гэта факт. Ды ці толькі тав. Кісялёў. У Веткаўскім раёне нямала кінамеханікаў, якія, гледзячы на свайго кіраўніка, ніколі не прыходзяць цвярозымі ставіць кінафільм.

Перад сваім прызначэннем на пасаду загадчыка раённага аддзела культуры П. Бабіч быў старшынёю аднаго з калгасаў. Затым у яго пагоршылася здароўе, кіраваць шматгаліннай гаспадаркай стала яму не пад сілу, і райком партыі паслаў П. Бабіча загадваць установамі культуры. І ніхто пры гэтым прызначэнні не падумаў, што ён менш за ўсё падыходзіць да гэтай пасады. Ніхто не ўспомніў, што П. Бабіч у апошні час паводзіў сябе з калгаснікамі вельмі груба, і там, у калгасе, ён часта дзейнічаў метадамі адміністравання.

У абласным упраўленні культуры нам паказвалі асабістыя справы загадчыкаў раённых аддзелаў. І трэба сказаць шчыра: вопыт работы ў гэтай галіне і спецыяльную адукацыю маюць толькі некаторыя з іх. Большасць раней займала пасады вельмі далёкія ад культуры. Так, адзін з іх быў спачатку старшынёю прамарцелі, а затым старшынёю сельсавета, другі — следчым, трэці — дырэктарам райпрамкамбіната, чацвёрты — працаваў загадчыкам аддзела сацзабеспячэння... Загадчыкамі аддзелаў культуры прызначаюцца работнікі самых розных прафесій. Магчыма, самі па сабе гэта добрыя, энергічныя работнікі, але няўжо цяжка падабраць на гэтыя пасады людзей з адпаведнай спецыяльнай адукацыяй і вопытам работы ва ўстановах культуры?

Тое ж самае можна іншы раз сказаць і пра загадчыкаў клубаў і бібліятэк. У Хойніках вызвалілася пасада загадчыка раённай бібліятэкі. Зразумела, на гэта месца трэба было падабраць кваліфікаванага бібліятэчнага работніка, тым больш, што такія ў раёне ёсць. Але ў райкоме партыі падышлі да гэтай справы інакш. На пасаду бібліятэкара трапіў А. Аніскавец, які за апошнія гады прымільгаўся хойніцкім жыхарам як рэвізор-кантралёр аўтобусных ліній. А. Аніскавец быў абавязаны правяраць у пасажыраў білеты ды падганяць шафёраў аўтобусаў, каб тыя асабліва не заседжваліся ў чайной.

Мы спыталі ў сакратара райкома партыі тав. Рожына, якімі меркаваннямі ён кіраваўся ў дадзеным выпадку.

— Яго пасаду скарацілі і ён доўгі час хадзіў без работы. Да таго ж ён нас запэўніў, што справіцца са сваімі абавязкамі.

— Як жа ён здолее працаваць, калі ў яго ні вопыту, ні адпаведнай адукацыі? Тут патрэбна не толькі любіць і ведаць літаратуру, трэба валодаць бібліятэчнай справай, умела прапагандаваць кнігу, аказваць метадычную дапамогу сельскім, калгасным, школьным і прафсаюзным бібліятэкам раёна.

Але тав. Рожын адказаў абыякава:

— Не справіцца — здымем.

Няўвага да кадраў работнікаў культасветустаноў прыводзіць да іх вялікай цякучасці. Толькі за мінулы год у Гомельскай вобласці змянілася 567 загадчыкаў сельскіх і калгасных клубаў. Гэтая трывожная лічба, якая пераканальна гаворыць, што трэба больш сур'ёзна ставіцца да дзейнасці асяродкаў культуры на вёсцы.

Бясспрэчна, многа карыснага робіцца ў сельскіх культасветустановах. Але яшчэ нямала патрэбна для таго, каб клубы, бібліятэкі сталі асяродкамі культуры на вёсцы ў поўным сэнсе гэтага слова.

В. ШАЦІЛА.

Заслужаным поспехам карыстаецца ў працоўных горада і раёна танцавальны калектыў Баранавіцкага клуба чыгуначнікаў. У рэпертуары самадзейнага калектыву — рускія і беларускія танцы, танцы народаў СССР і краін народнай дэмакратыі.

На здымку: выступленне чыгуначнікаў на свяце моладзі Баранавіцкага раёна, якое праходзіла на беразе возера Гаць.

Фота **А. Перахода.**

Фотахроніка БЕЛТА.





Часопіс выйшаў у свет...

З асаблівым пачуццём бярэш у рукі чарговы нумар часопіса. Што ў ім? Сведкам якіх мастацкіх адкрыццяў станеш ты сёння, радкі чыіх вершаў западуць табе ў сэрца, з героямі чыіх твораў пасябруеш ты надоўга? І, безумоўна, чакаеш адказу на пытанні, праблемы, якія хвалююць цябе сёння: часопіс — гэта перш за ўсё трыбуна сучаснасці.

Быць заўсёды на пярэднім краі жыцця, дапамагаць партыі і народу ў здзяйсненні іх велічных спраў заклікае пісьменнікаў перадавы артыкул чэрвеньскага нумара «Полымя», прысвечаны важнаму партыйнаму дакументу — апублікаванаму ў часопісе «Коммунист» скарочанаму пераказу выступленняў М. С. Хрушчова на сустрэчах з прадстаўнікамі нашай інтэлігенцыі, на прыёмах у гонар пісьменнікаў і кампазітараў Расійскай Федэрацыі. У перадавым артыкуле падкрэсліваецца, што першачарговая задача пісьменнікаў — напісанне высокамастацкіх твораў пра нашага сучасніка, чалавека высокіх грамадскіх ідэалаў, будаўніка камунізма.

На старонках чэрвеньскага нумара «Полымя» творы аб сучаснасці займаюць значнае месца. Тут і новыя вершы П. Панчанкі, Р. Барадуліна, Р. Няхая, і п'еса П. Васілеўскага «Любоў, Надзея, Вера», і аўтабіяграфічныя нататкі З. Азгура, у якіх моцна гучыць тэма еднасці мастака з народам, сувязі яго творчасці з самымі надзённымі праблемамі сучаснасці. Сваімі ўражаннямі пра гэтыя творы, як і пра новы раман А. Кулакоўскага «Сустрэчы на ростанях», дзеляцца сёння на старонках нашай газеты пісьменнікі і крытыкі.

Цікавае пачынанне часопіса — падборка матэрыялаў пад назвай «Слова па шчырасці». Гэта артыкулы ўкраінскіх крытыкаў аб сваіх сябрах — беларускіх пісьменніках, дасланыя ў «Полымя» рэдакцыяй харкаўскага часопіса «Прапор».

Беларуская крытыка прадстаўлена ў гэтым нумары часопіса сціпла. Няма ніводнага артыкула пра сённяшні літаратурны працэс, у раздзеле крытыкі і літаратуразнаўства змешчаны толькі нататкі М. Мушынскага «З творчай гісторыі «Новай зямлі» — пра выспяванне задумы і жанравае станаўленне гэтага класічнага твора нашай літаратуры. Артыкул з цікавасцю будзе чытацца не толькі тымі, хто спецыяльна займаецца вывучэннем творчасці вялікага паэта. У ім як бы прыадчынена заслона над таямніцамі творчасці, паказана «лабараторыя» мастака — і гэта добра. Шкада толькі, што аўтар, неадрыўна ідучы за паэтам у час яго працы над творам, часта завельмі спыняецца на прыватных момантах, усюды шукае апраўдання новых тэкставых замен па прынцыпу: раз пераароблена—значыць стала лепш. Што лепш, пра гэта спрачацца не варта, але аднастайнасць аналізу ў такіх выпадках відавочная, да таго ж, аўтар дзе-нідзе з-за гэтага губляе і другі план даследавання — больш шырокі погляд на твор у цэлым.

Неўміручаму Горкаму, сэрца якога перастала біцца дваццаць пяць год назад, прысвячаюць словы ўдзячнасці і павагі пісьменнікі І. Шамякін, В. Быкаў, В. Адамчык.

Матэрыял, які, безумоўна, зверне на сябе ўвагу, — франтавыя нататкі «Па ваенных дарогах» Я. Міско, якія чамусьці змешчаны пад рубрыкай «Публіцыстыка», хоць хутчэй належаць да жанра дзённіка ці ўспамінаў.

Чарговы нумар «Полымя» выйшаў у свет. Пажадаем яму шчаслівай дарогі да чытача.

З БЛІЗКАЕ ДАЛЕЧЫ

ПАЭТА, які бярэцца пісаць пра жыццё ў далёкіх краінах, як правіла, падпільноўваюць дзве небяспекі. Першая з іх — небяспека апынуцца ў палоне самых агульных уяўленняў аб чужым чалавечым побыце. Чытаеш некаторыя вершы пра заграніцу і думаеш: навошта было іх аўтару перціся ў гэтакую далечыню, калі яго погляду нічога не адкрылася, нічога не спыніла яго ўвагі? Такія вершы чытаць сумна. Нявесела, аднак, чытаць і вершы другога гатунку, тыя, дзе ў дробязных назіраннях і карцінках губляецца, глухне ідэя паэта, яго ўмельства асэнсоўваць бачанае.

Пімен Панчанка, аўтар надрукаваных у шостым нумары «Полымя» вершаў пра Афрыку, увогуле шчасліва пазбег як адной, так і другой небяспекі. Гэта зусім не значыць, што паэт знайшоў нейкую «залатую сярэдзіну» паміж «думкай» і «фактам», што ён проста нанізвае афрыканскія ўражанні на нітачку загадзя падрыхтаванай «ідэі».

Не, уражанні і факты пададзены Панчанкам так, што яны не трацяць сваёй рэальнай пераканальнасці, як факты жыцця, убачанага і адкрытага ўпершыню. Ведаючы Афрыку па кніжках, я не магу, вядома, меркаваць, наколькі дакладная тая карціна, якую намаляваў П. Панчанка, але я не магу не паверыць паэту, калі ён расказвае пра маракансікіх музыкаў, што грэюць на кастрах свае бубны, «каб яны грымелі ўсё званчэй». Або, калі ён гаворыць пра вясёлага абадранца, што крычыць на мове су-су, «каб куплялі па дзяшоўцы загадкавых ідалаў». Або малюе вялізнага матыля, які п'е «агнявую расу»... З мяне, чытача, хопіць адчування, што такога не выдумаеш за сталом, не напішаш, седзячы ў хаце, і якраз гэтае адчуванне і з'яўляецца прычынай даверу да аўтара, які знаёміць мяне з далёкім кантынентам.

Што датычыць ідэі панчанкаўскага цыкла, дык яна ў настойлівым імкненні паэта разгледзець сёняшняе аблічча бурнай, трагічнай, абуджанай да барацьбы каланіяльнай Афрыкі, якая і ў трэску цыкад, і ў пошуме лесу, і ў енку гвінейскіх або сенегальскіх матак чуе адно — мужны, няскораны голас Лумумбы...

І яшчэ адна ідэя займае вялікае месца ў новай нізцы П. Панчанкі: ідэя непарушнай дружбы паміж народамі Афрыкі і народам Савецкай краіны. Пра гэта напісаны, у прыватнасці, верш «Гвінейцы». Не думаю, каб ён належаў да лепшых твораў паэта. У ім палітычная думка ляжыць на паверхні і выказана праз словы недастаткова важкія («на тварах гвінейцаў такая сардэчнасць, такое давер'е харошае...», «калі ты іх сябра — сустрэнуць гасцінна і пачастуюць бананамі»). Верш атрымаўся агульны, «голы», — пазбаўце яго гэтых «бананаў», ды яшчэ «высокіх і трохі пакрыўленых пальмаў» у першых радках, і гвінейцы могуць быць заменены прадстаўнікамі любой іншай нацыі. Убачанай Афрыкі тут малавата. І не столькі вобразам дружбы, колькі сімвалам яе, адцягненым знакам выглядаюць заключныя радкі верша: «Мінчанін з гвінейцам над чарцяжамі галовы схілілі дружна».

З найбольшай паўнатой і сілай выказана ідэя інтэрнацыянальнага яднання праз цэнтральны вобраз цыкла — праз характар самога паэта-падарожніка. Ён вельмі нам цікавы, гэты чалавек: разумны, шырокі ў поглядах, надзвычай далёкі ад правінцыяльнай абмежаванасці, якую некаторыя нашы вершатворцы чамусьці блытаюць з сапраўдным патрыятызмам.

Адказваючы на нейчы разгублены голас: «Дзівак, дзівак, нарэшце, растлумач ты, чаго ты падарожнічаць улёг?», Панчанка піша: «Мне хочацца пабыць між афрыканцаў, рукой крануць, паспрабаваць на зуб іх соль і хлеб, іх працу, песні, танцы...» І далей:

Даведацца, каго абараняем,
Хто супраць нас, а хто
супроць вайны;
Хто я — ці госць звычайны, ці
радня ім,
Ці знаюць нас, ці вераць нам
яны.
. . . . . .
Хачу зрабіцца хоць маленькім
мостам
Між імі і табой, зямля мая.

Шкада, што так тлумачачы свае «дзівацтвы», надаючы ім характар пэўнай грамадскай пазіцыі, аўтар спрачаецца з тым, «хто сонным сэрцам атлусцеў між дываноў і хатняга ламмача...» Сучасны Абломаў — што з яго возьмеш? Паспрачацца, ды яшчэ горача, з перцам, як гэта ўмее рабіць Панчанка, трэба было-б імённа з тымі, хто бярэ пад сумненне права і абавязак савецкага чалавека ўспрыймаць, як сваю «асабістую справу», усё, што адбываецца на зямлі, ва ўсіх кутках неабсяжна вялікага свету.

Тое, што Пімен Панчанка стварыў у апошні час, у прыватнасці, яго афрыканскі цыкл (у ім, паўтараю, ёсць рэчы, напісаныя на розным узроўні), і з'яўляецца па сутнасці адным суцэльным усхваляваным маналогам пра падзеі сучаснай гісторыі. І не толькі цікаўнасць турыста, не страсць археолага прывялі паэта на руіны Карфагена, а зноў жа непакой грамадзяніна, клопат савецкага чалавека, які не хоча, каб новы Гомель, «схуднелы і стрыманы», кратаў наском парыжэлага салдацкага бота палітую крывёй і потам старажытную зямлю Афрыкі...

Добра, слаўна працуе, расце, набывае сапраўднае майстэрства Рыгор Барадулін! Сем новых вершаў надрукаваў ён у апошнім нумары «Полымя». Новых не толькі па часе свайго напісання, але і таму, што, чытаючы гэтыя вершы, можна ўбачыць, як узбагачаецца новымі якасцямі паэзія Р. Барадуліна. Раней мы сустракалі ў яго нямала вершаў, разгорнутых, як ланцужок асобных вобразаў, маляўнічых, яркіх і сакавітых, але недастаткова апладнёных адзінай лірычнай думкай, цэласным светаадчуваннем: што ні радок, дык новая ўспышка, новы ўсплёск. Цыкл, надрукаваны ў «Полымі», сведчыць, што Барадулін, які заўсёды умеў бачыць паэтычна, пачынае гэтак жа паэтычна думаць. У яго творы ўсё шырэй уваходзіць чалавечае, сацыяльнае, грамадзянскае, і гэта радуе, і гэта абяцае новыя поспехі ў далейшым.

Цёплае, спагадлівае пачуццё выклікае цудоўны верш «Амерыка», — пра тое, як калісьці «слугач, што неяк выбіўся ў падпанкі», «рашыў назваць Амерыкаю вёску» на Шклоўшчыне, пра «амерыканцаў», што едуць на кірмаш:

Кій на плячы — на ім з
паладнем торбу
Трымаюць, каб лягчэй было
каню.
Цыгаркі круцяць:
—Толькі б добры торг быў...
— Дуброва, дай Амерыцы
агню!..
Мурзаты дубраўчанін сцежкай
роснай
У доўганькай кашульцы, без
парткоў
Па яйка велікоднае да хроснай
Пяшэчкам у Амерыку ішоў...

Хораша, праўда? І яшчэ адзін вельмі добры верш надрукаваў Барадулін: «Труба».

Значна слабей напісаны такія вершы Барадуліна, як «Ліст да Фідэля Кастра» і «Нараджэнне 41-га года». Але яны вызначаюць напрамак, і ў гэтым іх бясспрэчнае значэнне ў творчасці таленавітага паэта. Ва ўсякім разе, гэтыя вершы здаюцца мне цікавейшымі за вялікі верш «Саганы», напісаны ў «старой» барадулінскай манеры: маляўнічна, але рассыпіста, свежа, але трохі бяздумна. А ўвогуле Барадулін працуе добра, расце шпарка.

Рыгору Няхаю ўласціва тое, што можна назваць талентам дружбы, і зусім натуральна, што пасля вялікага перапынку ён выступіў з баладай, прысвечанай цудоўнаму армянскаму паэту Геворку Эміну. Балада апавядае пра вайну, пра дружбу двух партызан — беларуса і армяніна, пра тое, «пачуццё сям'і адзінай», што яднае савецкіх людзей розных нацыянальнасцей. І яшчэ адзін верш змясціў Р. Няхай — «Целяханы», прысвечаны памяці Веры Харужай. У гэтым вершы пранікнёна гучыць лірычны, ад аўтара, скрайны матыў: «Целяханы мае, Целяханы, ў зорку вашу даўно закаханы», і, на жаль, не набраў вышыні, не прагучаў па-сапраўднаму эмацыянальна гераічны матыў барацьбы: «Помніць кожны, як мужная Вера уздымала людзей на паўстанне», «Помняць бор векавы і паляны, як ішлі у паход партызаны...» Унікаць агульшчыны—пазачарговая задача Рыгора Няхая, і будзем спадзявацца, што паэт справіцца з ёю.

Р. БЯРОЗКІН.

П'ЕСА ВЫКЛІКАЕ РОЗДУМ

Новая п'еса Пятра Васілеўскага «Любоў, Надзея, Вера...» выклікае шмат розных думак, разваг, не пакідае абыякавым да лёсу герояў твора, да тых праблем, пытанняў, якія ўзнімае аўтар. А драматург ставіць даволі складаныя жыццёвыя пытанні, якія не могуць не хваляваць савецкага чалавека.

У цэнтры ўвагі драматурга—сучасная моладзь, на долю якой выпала вялікае шчасце — сваімі рукамі будаваць камунізм.

Дзеянне драмы разгортваецца на будаўніцтве вялізнага хімкамбіната — адной з грандыёзных новабудоўляў сямігодкі. Сюды прыехалі юнакі і дзяўчаты, якія толькі што закончылі сярэднюю школу і яшчэ не маюць не толькі пэўнай кваліфікацыі, але і неабходных працоўных навыкаў, не знаёмы з працоўным мазалём.

Паступова, крок за крокам, жыццё загартоўвае маладых людзей, выхоўвае ў іх мужнасць, настойлівасць. Праўда, у п'есе мы неяк не адчуваем усёй атмасферы будаўніцтва, не бачым, як праца перавыхоўвае чалавека, як яна дабратворна ўплывае на яго, як у працэсе працы чалавек пазбаўляецца многіх сваіх хібаў, становіцца лепшым, больш «чалавечным», маральна ўстойлівым. І справа не ў тым, каб драматург паказаў нам нейкія вытворчыя працэсы (даволі мы іх начыталіся і нагледзеліся), а ў тым, каб паводзіны і ўчынкі герояў пэўным чынам былі звязаны з пафасам стваральнай працы чалавека, з яго працоўнымі буднямі.

Драматург галоўную ўвагу аддаў праблемам жыццёва-філасофскім, маральна-этычным, каханню, дружбе, асабістаму шчасцю. У пачатку твора аўтар як бы выклікае свайго сучасніка на «душэўную і сур'ёзную размову» аб шчасці чалавека, аб яго месцы і ролі ў жыцці. Пісьменнік гаворыць, што савецкі чалавек пакарае сілы прыроды, стварае індустрыяльныя гіганты, робіць незвычайныя адкрыцці, заваёўвае космас, здзіўляючы гэтым увесь свет. Але ў сваім асабістым жыцці гэты чалавек-творца часам трапляе ў палон старых звычак, нораваў, яму не хапае часам шырыні погляду на жыццёвыя з'явы, часам ён не ўмее спалучаць свае асабістыя інтарэсы з грамадскімі, з інтарэсамі іншых людзей, часам душэўная трагедыя выбівае яго з жыццёвай каляіны, і ён траціць веру ў свае сілы, у сваё шчасце. Студэнтка педінстытута Люба Корань — натура надзвычай рамантычная, чуллівая, экзальтаваная — не здолела знайсці сваё сапраўднае месца ў жыцці. Першыя ж жыццёвыя выпрабаванні падкасілі канчаткова маладую дзяўчыну, і яна трагічна гіне. І трагедыя яе не ў тым, што яна шчыра пакахала жанатага пажылога чалавека, які адказаў ёй узаемнасцю, і гэтым самым разбіла сямейнае жыццё, а ў тым, што каханне яе з'явілася нейкай сляпой сілай, якая засланіла ўсё астатняе. З-за кахання яна кідае інстытут, едзе на будоўлю, каб толькі быць побач з каханым. Яе каханне, яе незямныя мары перашкаджаюць ёй жыць нармальным паўнакроўным жыццём. А мара толькі тады можа памагаць чалавеку ў яго жыцці, калі яна мае пад сабой рэальную глебу; калі ж яна не мае гэтага, то становіцца бясплоднай фантазіяй і замінае чалавеку жыць, любіць, цяпроза глядзець на рэчаіснасць, скоўвае яго творчыя сілы. Аўтар асуджае гераіню за такую яе мару, за вельмі вялікія прэтэнзіі да жыцця: «Ты шукаеш большага, чым можа даць жыццё. Твае мары ўзлятаюць высока, і ты траціш сувязь з зямлёй... Ты нічога не значыш, калі ты адна Ты абараніла сваё права на любоў Цяпер змагайся за любімага... Але змагаючыся за сваё шчасце, думай аб шчасці другіх...» (падкрэслена намі. — А. С.). Гэтыя апошнія словы з'яўляюцца як бы вывадам аўтара аб тым, што такое чалавечае шчасце. Чалавек, падкрэслівае пісьменнік, можа быць шчаслівым тады, калі ён жыве не толькі для сябе, а і для другіх для калектыву, калі ён здабывае шчасце сабе і другім. А Люба Корань змагалася толькі за сваё ўласнае, маленькае, эгаістычнае шчасце, за месца пад сонцам толькі для сябе і свайго любага. Такое «шчасце» не можа быць паўнацэнным.

У п'есе «Любоў, Надзея, Вера...» дзейнічаюць людзі з рознымі характарамі, з рознымі ідэаламі, з рознымі поглядамі на жыццё, на каханне, на шчасце. Вось перад намі маладая дзяўчына Нюра Люцікава, якая выступае ў пэўным сэнсе антыподам Любы Корань. Калі Люба не можа ўладкаваць сваё жыццё, жыве нейкімі незямнымі ідэаламі, то Нюра, наадварот, надзвычай «зямны» чалавек; яна хутка «асвойталася» на будаўніцтве, адкінула прэч усякія «высокія матэрыі» і імкнецца як найлепш прыстасавацца да жыцця, знайсці добрага мужа і зажыць спакойна і ўтульна. Свае жыццёвыя «ідэалы» яна даволі цынічна выкладае сяброўкам і раіць ім «пляваць на ўсё, берагчы здароў'е». «Я раней таксама пра ўсякія высокія матэрыі думала,— гаворыць яна Любе. — Паверыш, абсалютна нічыра прыехала сюды на будаўніцтва. Думала, вось дзе сапраўдны гераізм! А як прыгледзелася, нацярпелася... Ой, якая я дурная была! Я ж у школе ў насценгазету крытычныя заметкі пісала. Даручэнні ўсякія выконвала. А як пажыла самастойна, пераканалася: хто, як умее, той так і прыстасоўваецца... Жыць... трэба з толкам. Ліхое абыходзь, а за добрае чапляйся». І Нюра «зачапілася» за намесніка дырэктара па быту Кісялёва, цудоўнага работніка, сціплага і чэснага чалавека.

Знаёмячыся з персанажамі п'есы П. Васілеўскага, нельга не заўважыць, што аўтару ўдалося ўгледзець амаль у кожнага з іх штосьці сваё, індывідуальнае, удалося стварыць разнастайныя партрэты жывых людзей, з уласцівымі ім станоўчымі і адмоўнымі якасцямі, чалавечымі слабасцямі. Праўда, П. Васілеўскаму ў большасці выпадкаў не ўдалося да канца раскрыць характары сваіх персанажаў, глыбока вывяўць іх псіхалогію. Асабліва гэта датычыць станоўчых персанажаў. Нават такія людзі, як Зорын і Васіль Корань, якія больш за ўсіх дзейнічаюць у п'есе, у псіхалагічным плане не даведзены, як нам здаецца, да лагічнага завяршэння. Калі ж браць другіх станоўчых герояў, то вобразы некаторых з іх (напрыклад, Аляксея Каляды) намечаны толькі пункцірна.

У сэнсе драматургічнага майстэрства новая п'еса Пятра Васілеўскага мае шмат пераваг над яго ранейшымі п'есамі. Перш за ўсё яна вызначаецца дынамічным сюжэтам, што асабліва неабходна для драматычнага твора. Падзеі разгортваюцца імкліва, хутка, хаця часам гэта імкліваець празмерная, асабліва ў змене сцэн, якая іншы раз адбываецца з кінематаграфічнай хуткасцю. Значна ўзрасло і моўнае майстэрства драматурга. Мова персанажаў часам насычана даволі багатым і цікавым падтэкстам, гумарам, трапнымі афарызмамі, дасціпнымі жартамі. Усё гэта вельмі ажыўляе п'есу ў цэлым, робіць яе больш цікавай, эмацыянальнай, больш даступнай для ўспрыняцця.

А. СЕМЯНОВІЧ.

На скрыжаваннях ваенных дарог

Памятаецца, у адной з рэцэнзій на раман Аляксея Кулакоўскага «Расстаёмся ненадоўга» было заўважана, што яго загаловак не зусім адпавядае зместу. Развёўшы герояў па ваенных дарогах, пісьменнік так і пакінуў іх у стане чаканняў і надзей на сустрэчы. Камандзір партызанскай брыгады Андрэй Сакольны і камісар Мікіта Мінавіч Труцікаў у канцы рамана пакуль што яшчэ нічога не ведалі пра сваіх жонак Веру Усцінаўну і Ганну Сцяпанаўну, якія, між іншым, знайшлі прытулак у добрых людзей на той бок фронта, у варонежскай вёсцы.

Аказваецца, раман «Расстаёмся ненадоўга» быў задуманы толькі як першая частка вялікага твора пра мінулую вайну. Прайшло шэсць год, і вось у дзвюх апошніх кніжках «Полымя» мы чытаем новыя старонкі гэтага твора — раман «Сустрэчы на ростанях». «Другая кніга дылогіі» — памеціў яго аўтар.

Мяркуючы па ўсяму, і гэта яшчэ не канец, хоць зноў-такі на апошняй старонцы не даецца ніякіх абяцанняў, а твор названы дылогіяй самім аўтарам. Сустрэчы ў рамане адбываюцца, часам самыя нечаканыя, аднак лёс усё яшчэ абдзяляе гэтай радасцю галоўных герояў. Яны ўсяго што — атрымалі весткі адзін пра аднаго.

Безумоўна, выказваць думкі пра незавершаны твор — справа складаная і рызыкоўная. Хоць бы таму, напрыклад, што новыя яго раздзелы могуць асвятліць усё папярэдняе зусім нечаканым святлом. І калі ўсё ж гэтая акалічнасць не спыняе нас выказаць некаторыя думкі аб рамане «Сустрэчы на ростанях», то тут перамагло жаданне адрэкамендаваць яго чытачу як уражальную, напісаную з пачуццём сучаснасці карціну пакут і героікі, якімі адзначаны незабыўныя гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пісьменнік узяў той момант у развіцці барацьбы ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў, калі фронт набліжаўся да межаў рэспублікі і партызанскія сілы вытрымлівалі самыя жорсткія выпрабаванні, бо вораг імкнуўся ўсімі сродкамі аднавіць кантроль над тылавымі камунікацыямі, загнаць партызан у балоты і знішчыць іх там.

Партызанская зона, якой нядаўна не было канца-краю, цяпер часам звужаецца да пятачка кругавой абароны дзе-небудзь на выспе сярод балот. Партызаны нясуць вялікія страты. І ўсё ж ідэя перамогі вызначае пафас рамана. Яна прабівае сабе дарогу як непахісная заканамернасць часу і вырастае перш за ўсё ў сферы даследавання маральнага аблічча ўдзельнікаў падзей. Мікіта Мінавіч, які быў захоплены ў безвыходным становішчы гітлераўцамі, урэшце рэшт мог і загінуць. У тым, што яго партызаны выратавалі, многа выпадковага, што ідзе ад шчаслівага збегу акалічнасцей (дарэчы сказаць, вельмі ўжо шчаслівага — да непераканаўчасці). Але і пры трагічным зыходзе лёсу героя мы гаварылі б пра перамогу гэтага «жалезнага дзеда», як яго назваў Кандрат Ладуцька. Бо хіба ж гэта не вялікая перамога, калі нямецкі салдат, якому давялося назіраць усе пакуты, што прыдумалі фашысцкія каты для палоннага камісара, у захапленні гаворыць, што «за такога рускага нават ён аддаў бы сваё жыццё»?!

У новым рамане пісьменнік ідзе да аптымістычнага пафасу больш складаным, больш мастацкім шляхам, чымся ў папярэднім. Гэта звязана і з тым, што яго талент пасталеў, пасмялеў, і ўвогуле з узросшымі ў апошні час патрабаваннямі да літаратуры пра мінулую вайну.

Прыкметы плённых пошукаў відаць і ў завостранасці асноўнай думкі-ідэі рамана, якая збірае ў сабе, як у фокусе, разнастайныя па сэнсу гісторыі і эпізоды і ў канчатковым выніку вызначае кампазіцыю. Гэта, я сказаў бы, раман пра гуманізм — пра глыбока гуманістычны характар нашай барацьбы з фашызмам, нашай маралі, нашага кодэксу ўзаемаадносін паміж людзьмі, раман, у якім пісьменнік імкнуўся паставіць тэму чалавечнасці ў самых розных яе аспектах. Многае ў гэтым напрамку яму ўдалося зрабіць памастацку, пераканаўча, многае ж носіць аднакі ілюстрацыйнасці, неабгрунтаванасці, калі логіка думкі пераважае над жыццёвай логікай падзей і характараў.

«Гаворка ідзе аб тым, што нам трэба ўмець разбірацца не толькі ў абставінах, у розных вайсковых сітуацыях, а і ў людзях. Перш за ўсё ў людзях!» — падкрэсліваў Андрэй Сакольны ў гутарцы з Кандратам Ладуцькам. А выклікана гэтая размова тым, што па загаду Ладуцькі, аддадзенаму неабдумана, у панічным стане, былі расстраляны два сумленныя чалавекі—брат дакторкі Міця і нечкалёп Гірня. Пісьменнік спрабуе ускрыць больш глыбокія, чымся звычайныя неабдуманасць і паспешлівасць, прычыны ўчынку Ладуцькі. «Не ўсюды будзеш вінаваціць яго аднаго, — разважае Андрэй Сакольны. — Калі ўдумацца глыбей, то гэты чалавек— толькі маленькі, прыморанны папугайчык. Слабым, гугнявым галаском ён часам намагаўся паўтараць тое, што слепа ўспрыняў ад некаторых іншых. І пэўна ж не адна яго віна, што гэтыя іншыя стварылі месцамі жудасную атмасферу недавер'я і падазронасці між людзьмі. Стварылі яе да вайны, а ў вайну яна часам яшчэ больш згушчаецца».

Трэба сказаць, што гэтая думка выглядае ў рамане выпадковай, нечаканай. Яна не даведзена сюжэтам і не стасуецца да характару Ладуцькі, тым больш таго, з якім мы пазнаёміліся ў рамане «Расстаёмся ненадоўга». Нестае матывіроўкі і акалічнасцям расстрэлу Гірні і Міці. Дапусцім, што Ладуцька мог аддаць такі загад. Але ж не верыцца, каб партызан — выканаўца яго, так вось проста страляў у людзей, якія пераконвалі, што выратавалі з гестапа камісара брыгады! Аргумент жа які!

Слушна заўважана, што жахлівае аблічча вайны, бадай, больш за ўсё відаць у дачыненні да дзяцей. Кулакоўскі як бы падхоплівае гэтую думку і, працягваючы яе, гаворыць: у дачыненні да дзяцей лепш за ўсё відаць і сэнс нашай барацьбы з фашызмам.

Тэма дзяцей і барацьбы за іх жыццё і будучыню—адзін з лейтматываў рамана. Раман і пачынаецца эпізодам, у якім партызанская дактарка Марыя Корнева, едучы на пабыўку да родных, сустракае дзяўчыну з малым, што цягнецца да аладкі, зляпленай з нейкага лісця. Потым яшчэ многа разоў будзе пісьменнік кранаць наша сэрца такімі і больш жахлівымі сцэнамі.

Думаецца ўсё ж, што дзіцячая тэма гучыць у рамане крыху аднастайна і «навязчыва», а таму не-не ды і ўзнікае адчуванне яе «зададзенасці». Можна гаварыць нават пра пэўную сентыментальнасць адпаведных старонак, хоць гэтае слова вельмі ж не ахвота ўжываць тут, улічваючы характар падзей.

У новым рамане Кулакоўскі застаецца верным сваёй апавядальнай манеры. Ён расказвае непаспешліва, грунтоўна, падоўгу спыняючы ўвагу на дэталях, іншы раз самых нязначных. Пра супярэчнасці аўтарскай манеры гаварылася ўжо неаднаразова. Яны даюць зноў адчуваць сябе. Падкрэсленая дэталізацыя садзейнічае рэльефнасці малюнка. Але часам гэта нагадвае рэльеф раўніны, па якой трэба доўга ехаць ці ісці, каб натрапіць на ўзгорак-вышыню. «Апорныя ж пункты» празаічнага сюжэта хочацца параўнаць іменна з узгоркамі-вышынямі, на якіх кіпяць гарачыя баі за панаванне над мясцовасцю.

Знайшоў пісьменнік сваю псіхалагічную вышыню для Мікіты Мінавіча, для Вары, для Ладуцькі. Адразу неяк узыйшоў на яе Гірня. А вось Андрэй Сакольны, Марыя Корнева, Міша Глінскі ўсё яшчэ едуць па раўніне.

Ды паўторым—твор не закончаны, і з канчатковымі меркаваннямі не будзем спяшацца.

Н. ПАШКЕВІЧ.

У ЛІПЕНЬСКІМ НУМАРЫ

Нумар адкрываецца падборкай матэрыялаў «Да свята рускай літаратуры ў Беларусі» з уступным словам Петруся Броўкі. Надрукаваны вершы М. Ісакоўскага, А. Пракоф'ева, А. Твардоўскага, Я. Вінакурава, А. Суркова, Л. Мартынава, І. Аўраменкі, М. Грыбачова, К. Сіманава, М. Рыленкава, М. Луконіна, В. Бергольц, Б. Слуцкага, М. Брауна, К. Ваншэнкіна, Я. Еўтушэнкі, М. Дудзіна, С. Арлова, В. Бокава ў перакладах беларускіх паэтаў.

Друкуюцца новыя вершы С. Дзяргая і «Кантата аб Веры Харужай» А. Астрэйкі.

Проза прадстаўлена раманам М. Лобана «На парозе будучыні» (з трылогіі «Шэметы»). Герою Сацыялістычнай Працы Марыі Макарэвіч прысвяціла свой нарыс «У суседстве з сонцам» А. Васілевіч.

150-годдзе з дня нараджэння В. Р. Бялінскага часопіс адзначае артыкулам К. Буслава «Бялінскі і наша сучаснасць».

Успаміны пра сустрэчы з Купалам напісаў для часопіса М. Машара.

Пад рубрыкай «Крытыка і літаратуразнаўства» — артыкул Я. Герцовіча «Пошукі і іх напрамак».

У раздзеле «Бібліяграфія» — рэцэнзіі С. Александровіча «Цудадзейная сіла слова» (на кнігу Ул. Юрэвіча «Слова і вобраз») і М. Стральцова «Прыход сталасці» (на зборнік «Размова з сэрцам» А. Зарыцкага). Надрукавана таксама некалькі кароткіх рэцэнзій. У канцы часопіса старонка гумару.

ПРА ЧАС І ПРА СЯБЕ

Жанр мемуарнай літаратуры, які, на жаль, яшчэ ў нас, на Беларусі, не атрымаў шырокага развіцця, вельмі цікавы і патрэбны. У кожным такім творы, калі ён напісаны ад шчырага сэрца, чытач можа і павінен знайсці расказ аўтара не толькі пра сябе, але і пра той час, пра тое асяроддзе, у якім жыў і працаваў чалавек; расказ пра грамадскія тэндэнцыі свайго часу, бо нават таленавіты чалавек без грамадскага асяроддзя, без яго штодзённага ўплыву можа апынуцца выкінутым на водмель і там засохнуць, заняпасці.

Вельмі добра робіць часопіс «Полымя», друкуючы на сваіх старонках аўтабіяграфічныя апавяданні, мастацкія біяграфіі пісьменнікаў, дзеячоў культуры і навукі. З цікавасцю былі сустрэты выступленні ў гэтым жанры старэйшых нашых пісьменнікаў Міхася Лынькова, Ільі Гурскага, Піліпа Пестрака. Звярнулі на сябе ўвагу чытача ўспаміны Міколы Хведаровіча, апублікаваныя спачатку ў часопісах, а пасля выдадзеныя асобнай кніжкай. Яшчэ большую цікавасць павінны мець мемуарныя творы работнікаў нашага беларускага мастацтва.

З вялікай цікавасцю я прачытаў у шостым нумары «Полымя» раздзел з кнігі «Незабыўнае» вядомага, лепшага нашага майстра скульптуры Заіра Азгура «Пра сябе». Грамадскасць нашай рэспублікі, ды і не толькі рэспублікі, ведае Азгура як найлепшага майстра скульптурнага партрэта, як мастака, які жыва адгукаецца на падзеі часу і ў сваёй творчасці сучасны ў поўным і вялікім сэнсе гэтага слова. Яго творы перыяду Айчыннай вайны, пасляваенных год заваявалі ўсенароднае прызнанне. Для чытача, відаць, будзе цікава даведацца як найбольш не толькі пра творы аўтара, але і пра яго самога. У гэтым яму ў значнай меры дапаможа задаволіць цікавасць надрукаваны раздзел «Пра сябе».

У раздзеле цікава і праўдзіва расказана пра першыя крокі будучага скульптара, якія пачаліся з таго, што ён з добрым ганчаром Піліпам Патапенкам ляпіў з гліны пеўнікаў і качак, якія свісцелі. У майстэрню неяк патрапіў Рабушкін, вучань вядомага тады ў Віцебску мастака Пэна. Рабушкін убачыў у хлопчыку таленавітага падлетка і звёў яго з Пэнам. Юрый Майсеевіч Пэн памог Азгуру зразумець сваё прызванне і мо' стаць на тую сцежку, якая прывяла яго ў вялікае мастацтва. Шкада, што аўтар вельмі бегла піша пра гэты перыяд вучобы ў вядомага беларускага мастака. Наша грамадскасць ведае Пэна па яго творчасці, і хацелася б, каб Азгур, які быў блізкі да мастака як чалавека больш падрабязна расказаў пра яго. Між іншым, гэта датычыць не толькі Пэна, але і такога мастака, як Міхаіл Аркадзьевіч Керзін, які таксама адыграў немаловажную ролю ў выхаванні Азгура як скульптара. Ды зрэшты, хацелася б прачытаць не толькі пра гэта. Віцебск у свой час быў асяродкам, у якім групаваліся нашы беларускія мастакі. Азгур жыў, выхоўваўся, далучаўся да вялікага мастацтва ў гэтым асяродку, і хацелася б, каб іменна ён не бегла, не мімаходзь, а падрабязна, з дэталямі ўзнавіў у сваёй цікавай рабоце той час, каб ён паказаў той уздым у развіцці беларускага нацыянальнага выяўленчага мастацтва, які быў выкліканы Вялікім Кастрычнікам. Магчыма, аўтар у далейшых сваіх раздзелах яшчэ вернецца да таго перыяду. Гэта было б вельмі добра. Магчыма, не варта было аўтару так падрабязна расказваць пра малазначны эпізод захаплення гіпнатызёрам Арнальдам, бо гэтае захапленне, відаць, не адыграла ніякай асаблівай ролі ў фармаванні густаў будучага мастака.

Азгур мімаходзь кранаецца таксама вельмі важнай для таго часу праблемы барацьбы з фармалізмам. Ён паведамляе чытачу, што пакінуў нават Ленінградскую Акадэмію мастацтва з-за таго, што не мог вытрываць практыкаванняў фармалістаў. На жаль, і гэты раздзел напісаны вельмі бегла, толькі як інфармацыйнае паведамленне. А хацелася б, каб аўтар з вышыні сённяшняга свайго творчага вопыту раскрыў вытокі фармалізму, агаліў яго непрывабную сутнасць, паказаў тое асяроддзе, якое ў той час жывіла ды яшчэ сям-там і цяпер жывіць гэтую ілжывую, антымастацкую плынь. Такое раскрыццё фармалізму, як з'явы дэградацыі мастацтва, відаць, адыграла б станоўчую ролю ў справе выхавання маладых мастацкіх кадраў. Праўда, аўтар спрабуе тэарэтычна развянчаць фармалізм, як антымастацкую з'яву. Ён сцвярджае наступнае: «Мабыць, таму, што цяжка дасягнуць майстэрства і класічнага ўмельства бачыць і адлюстроўваць свой час на такім узроўні, якога калісьці дасягалі класікі, гэтыя мастакі (фармалісты) лічаць за лепшае адыходзіць у нейкую больш лёгкую форму, як стылізацыя, або ў абагульненне, дзе не патрэбны дэталі, дзе іх можна абыйсці». Але нам здаецца, такое тэарэтычнае тлумачэнне па меншай меры палавіначатае, бо яно не ўлічвае сацыяльнай сутнасці фармалізму, як з'явы антыграмадскай і антымастацкай. На маю думку, аўтару варта было на жывых дэталях тагачаснага мастацкага жыцця раскрыць фармалізм. Ад гэтага б толькі выйграла яго работа.

Азгур чамусьці вельмі мімаходзь гаворыць пра беларускіх мастакоў дваццатых і трыццатых гадоў. Пра Усебеларускую мастацкую выстаўку 1925 года аўтар паведамляе ў інфармацыйным плане, што такая адбыл

ДЗЯКУЕМ, ГРОДЗЕНЦЫ!

Гастрольны сезон у Мінску сёлета цікавы і разнастайны: тут выступалі госці з Масквы, Кіева, Прыбалтыйскіх рэспублік і зарубежных краін. З поспехам прайшлі ў Мінску і гастролі Магілёўскага драматычнага тэатра, як заўсёды, пакарылі сваім шчырым і яркім самабытным майстэрствам калясаўцы.

Выклікаў цікавасць і прыезд вядомага ўжо мінчанам Гродзенскага драматычнага тэатра. Прыемна адзначыць, што гродзенцы прывабілі гледачоў сваімі любоўна зробленымі праграмкамі, прыгожымі афішамі. Усе падпісчыкі знайшлі ўкладзеную ў газеты фотарэкламу спектакля «Салдаты». І кожны прачытаў яе з вялікай цікавасцю, бо зроблена яна арыгінальна і прывабна. Многім, відаць, захацелася паглядзець спектакль, пазнаёміўшыся з гэтай адмысловай фотарэкламай. Гэта ўсё спрыяе святочнаму настрою.

Але гастролі не толькі свята, а і экзамен для кожнага творчага калектыву. Нас вельмі цікавіць, па якому шляху развіваецца майстэрства гэтага таленавітага калектыву, ці здольны ён захапіць майстэрствам рэжысуры, акцёраў, мастакоў?

Сцэна са спектакля «Салдаты». Люба — арт. Т. Шашкіна, яе маці — арт. М. Кавязіна.

І вось адкрылася заслона. Пачаўся спектакль «Салдаты» па п'есе В. Шаўрына. Мы адчуваем па першых рэпліках, як хвалююцца нашы госці, парушаюць рытм спектакля. Але гэта толькі спачатку. Кожная новая сцэна ўсё больш захапляе гледачоў. Кантакт паміж сцэнай і глядзельнай залай устаноўлены. Цяпер важна захаваць яго да канца спектакля. Ад гэтага залежыць поспех не толькі сённяшняй пастаноўкі...

Спектакль прыняты цёпла, сардэчна. Гледачы апладзіруюць акцёрам, а акцёры гледачам. Спектакль выклікаў і спрэчкі ў адрас драматурга, выканаўцаў асобных вобразаў.

Нягледзячы на раскіданасць п'есы, рэжысёру спектакля І. Папову і ўсяму творчаму калектыву, ўдалося стварыць спектакль хвалюючы і цікавы.

Спектакль пачынаецца з паэтычнага пралогу аб першых курсантах-чырвонаармейцах, якія ішлі складанымі шляхамі барацьбы за свабоду сваёй радзімы, за мірнае і творчае жыццё савецкага чалавека. Перад намі, як жывыя, узнікаюць старонкі барацьбы з ворагамі рэвалюцыі — бандамі басмачоў, з голадам і нястачай, гераічныя старонкі барацьбы ў дні Айчыннай вайны, на руінах Брэсцкай крэпасці і ў партызанскіх атрадах. У спектаклі праходзяць розныя людзі — камандзіры, воіны, шафёры, настаўнікі. Нельга без хвалявання гаварыць аб такіх эцэнах, як першая сустрэча чырвонаармейца Аляксея Таранава з юнай настаўніцай Любай, «сватанне», «новая кватэра», «дзень нараджэння». Поспеху спектакля спрыяе не толькі смелая рэжысёрская трактоўка, яркі і мужны яго тон, выразныя сцэны. У ім на поўны голас гучыць майстэрства акцёраў, вопытных майстроў і маладых выканаўцаў.

У гэтым цікавым ансамблі хочацца адзначыць працу заслужанай артысткі БССР М. Кавязінай, якая стварае шматгранны вобраз маці, напоўнены жывымі драматычнымі і камедыйнымі фарбамі, глыбокім падтэкстам.

Асабліва складаная і адказная задача ў выканаўцы вобраза Аляксея Таранава (арт. С. Аляксандраў), які праходзіць праз увесь спектакль ад пачатку першай сцэны да фіналу — ад курсанта-чырвонаармейца, маёра, — камандзіра партызанскага атрада, да палкоўніка і старшыні калгаса. У гэтага чалавека складаны жыццёвы шлях. Паказаць цэласнасць вобраза, які вызначае драматургічную аснову ўсёй п'есы, — адказная і пачэсная задача для акцёра. Трэба сказаць, што не ўсё ўдалося С. Аляксандраву. Іншы раз акцёр імкнецца «жыццё ў вобразе» падмяніць паказам, знешнім прадстаўленнем без глыбокага пераўвасаблення.

Падкупляюць сваёй праўдай жыцця ў спектаклі старшына Мікіта Лбоў у выкананні І. Ёнава, снабжэнец (В. Грачынскі), жонка камісара Марыя Фёдараўна (А. Панкрат), шафёр Ахальнікаў (В. Касценка), міліцыянер Бабкін (С. Храмцоў), паранены салдат і інш.

Асабліва радуе праца маладых акцёраў. Т. Шашкіна ў ролі настаўніцы Любы пераканаўча раскрывае гераіню ў розных абставінах. Мы бачым, як фармуецца, загартоўваецца яе характар. Есць у Шашкінай іншы раз жаданне «палюбавацца» сваім прыгожым голасам, знешнасцю. Варта папрацаваць яшчэ артыстцы над фінальнай сцэнай, знайсці больш характэрны грым для Любы, якая прайшла вялікі і суровы шлях жыцця.

Шчыры і непасрэдны Гога Шнеерсон у выкананні Г. Дубава. І хаця ён напісаны аўтарам для «лёгкага поспеху», аднак акцёр не злоўжывае камедыйнымі сітуацыямі, «не іграе на публіку».

Есць у гэтым свежым і хвалюючым спектаклі сцэнічныя страты і недаробкі. Гэта перш за ўсё кампазіцыйная расцягнутасць другога акта, які вельмі «падрабязны». Лішняя, на наш погляд, другая сцэна ў «Брэсцкай крэпасці». Самым слабым месцам п'есы і спектакля з'яўляецца карціна ў палявым шпіталі. Невыразная і слабая сцэна самадзейнага канцэрта Зойкі перад параненымі. Дарэчы, дрэнна гучыць голас Зойкі нават па радыё і ў фінальнай сцэне. Вядома, у спектаклі ёсць і другія недаробкі, але мы ведаем, што гэта новая праца тэатра, якая ўдасканальваецца і акцёрамі і рэжысурай на кожным новым паказе.

Агульнае ж уражанне такое, што хочацца сказаць: дзякуй, гродзенцы!

Ул. СТЭЛЬМАХ,
дырэктар Тэатра юнага гледача.

КІНО: УЗЯТАЕ З ЖЫЦЦЯ І ВЫДУМАНАЕ Ў КАБІНЕЦЕ

Не хацелася б паўтараць старую ісціну, што без добрага, паўнацэннага сцэнарыя нельга зрабіць добры фільм. Але пра гэта яшчэ і яшчэ раз даводзіцца гаварыць, таму што на студыі «Беларусьфільм» часам запускаюць у вытворчасць недапрацаваныя сцэнарыі, спадзеючыся на дапрацоўку іх у працэсе здымак. Што атрымліваецца з такіх «эксперыментаў», можна бачыць на прыкладзе навел, што ўвайшлі ў карціну «Апавяданні пра юнацтва».

Аўтары карціны паставілі за мэту ў чатырох аб'яднаных адной думкаю навелах расказаць пра асноўныя этапы гераічнага шляху камсамола Беларусі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў.

Кінематаграфічная навела — жанр складаны. Сцэнарый, у якім усяго некалькі дзеючых асоб, патрабуе ад аўтара асаблівай спрактыкаванасці.

Найлепшая ў фільме—навела «Сакратар павяткома», удача якой была ўжо закладзена ў літаратурнай першаснове — апавяданні А. Ісбаха «Расстрэл». Сцэнарыст М. Фігуроўскі, рэжысёр Б. Сцяпанаў і аператар А. Аўдзееў здолелі проста і сціпла расказаць гісторыю аб тым, як паранены актывіст сельскай ячэйкі Мікола трапіў у хлеў, куды белабандыты кінулі закатаваных членаў павятовага камсамольскага камітэта, і яны, асуджаныя на смерць, аднагалосна выбіраюць Міколу кіраўніком павятовага камсамола. Аўтары навелы знайшлі мноства пераканальных рыс і дэталей, якія ўзнаўляюць на экране незабыўную эпоху грамадзянскай вайны.

Парадавалі ў навеле таленавітыя дэбютанты, маладыя кінаакцёры—студэнты Інстытута кінематаграфіі В. Грачоў і В. Лысенка, якія стварылі прывабныя сваёй непасрэднасцю вобразы Міколы і Гані. І другарадныя персанажы акрэслены выразна. Аўтараў навелы можна папракнуць толькі за асобныя, нязначныя недахопы. Так вельмі ўжо па-сучаснаму выглядаюць прыгожа напісаная аб'ява аб камсамольскім сходзе і сама сцэна сходу, дзе акуратна расстаўлены крэслы, стол прэзідыума засланы сукном, на ім традыцыйны графін. Не ўсюды пастаноўшчыкі праявілі стылявую стрыманасць. А ў некаторых эпізодах яны падкрэслена дэманструюць сваю кінематаграфічную эрудыцыю не заўсёды апраўданымі ракурсамі, панарамамі, мантажнымі стыкамі.

Нядрэннае ўражанне пакідае і другая навела—«Камбуд» (сцэнарый П. Васілеўскага, рэжысёр В. Тураў, аператар А. Забалоцкі). У адборы выяўленчых сродкаў, якімі карысталіся маладыя мастакі, у агульным вырашэнні навелы выразна відаць імкненне працягваць лепшыя традыцыі паэтычнага кінематографа. Гэта можна заўважыць і ў інтанацыі, з якой аўтары расказваюць пра лёс маладой жанчыны, што парвала са сваім мужам, кулацкім сынам, і знайшла верных сяброў на камсамольскай будоўлі, і ў абмалёўцы характараў герояў, і ў адлюстраванні карцін роднай прыроды.

Аднак агульнае эмацыянальнае ўздзеянне навелы ў значнай меры зніжаецца з прычыны слабай драматургічнай асновы. Аўтар сцэнарыя П. Васілеўскі не здолеў знайсці самае характэрнае для 30-х гадоў, узнавіць слаўную пару ў жыцці нашай краіны, калі ў будніях сацыялістычнай будоўлі мужнеў і рос рабочы калектыў, складаліся новыя адносіны сярод людзей.

«Прарыў» Яня — арт. Ф. Громава.

Невыразна выпісаны вобразы герояў, ім нестае індывідуальных рыслаў, і таму для акцёраў — выканаўцаў асноўных роляў, нягледзячы на вонкавую вастрыню драматычных сітуацый, было мала іграваго матэрыялу. Асобныя сюжэтныя лініі навелы нечакана абрываюцца, у адных месцах адчуваецца скарагаворка, у другіх, наадварот, празмерная расцягнутасць. Так, у прыватнасці, атрымалася з эпізодам камсамольскага сходу, на якім прысутнічаюць маладыя будаўнікі, чамусьці апранутыя ў парадную форму—гімнасцёркі з партупеямі. Зусім зразумелае было жаданне аўтараў разгарнуць дзеянне на шырокім фоне, падкрэсліць шматлюднасць будаўніцтва. Але бяда ў тым, што само будаўніцтва ў навеле неканкрэтнае, будаўніцтва «наогул», і, магчыма, таму сход таксама атрымаўся «наогул». Цяжка зразумець, што на ім адбываецца, што ўсхвалявала моладзь, а значыць—дзеля чаго і зроблены гэты эпізод. Ён толькі замаруджвае тэмп, адцягвае ўвагу ад асноўнага дзеяння.

Каб як-небудзь кампенсаваць гэтыя недахопы сцэнарыя, рэжысёру давялося насычаць навелу вонкава драматычнымі эпізодамі ў выглядзе пагоні, схватак, пажараў і г. д.

Усё гэта не магло не прывесці да сюжэтнай раскіданасці і агульнай мастацкай незавершанасці навелы.

Калі другую навелу, як мы сказалі, давялося здымаць па слабому сцэнарыю, дык навела «Прарыў» (сцэнарысты Ул. Караткевіч і А. Ястрабаў, рэжысёр С. Браўдэ, аператар І. Рэмішэўскі) увогуле робіць уражанне адвольнай кінематаграфічнай імправізацыі. Яе з поўнай падставай можна назваць «аператарскай». І. Рэмішэўскі зазняў фільм у падкрэслена змрачнаватых тонах, здолеў добра перадаць агульную атмасферу цяжкага перыяду фашысцкай акупацыі. Робяць уражанне сваёй выразнасцю беларускія пейзажы, цікавыя буйныя акцёрскія планы. Але ўдалае выяўленчае вырашэнне толькі яшчэ больш адцяніла бездапаможнасць сцэнарыя. Сюжэт навелы пабудаваны на тым, што маладыя разведчыкі дапамагаюць партызанскаму злучэнню прарваць варожую блакаду, нанесці паражэнне гітлераўскім акупантам. Пра гэта расказана настолькі наіўна, што дзіву даешся, як гэта сёння магло выйсці на экран. Тут і дурныя немцы, якіх спрытна абводзяць вакол пальца разведчыкі, і міна, якую разведчыкі падкладаюць у будынак штаба ў момант прыезду нейкага важнага чына, і «класічная» сцэна пагоні немцаў за адважнымі разведчыкамі: імчыцца тачанка, стракоча кулямёт, ірвуцца гранаты, падаюць забітыя немцы... Адным словам, у навеле ёсць усе штампы, якія сустракаюцца ў дрэнных ваенна-прыгодніцкіх фільмах, але няма толькі аднаго—самастойнай творчасці, элементарнага мастацкага густу.

Сказанае, бадай, у яшчэ большай меры адносіцца да чацвёртай навелы—«Далі клічуць» (сцэнарый М. Фігуроўскага, рэжысёр Л. Дурасаў, аператар І. Пікман), якая павінна была неяк «вянчаць» увесь фільм. Агульная карціна жыцця камсамола, паказаная ў навеле, прадстаўлена фальшыва, лакіроўчна.

Сам сюжэт навелы—узор кабінетнай драматургіі, у якой няма нават адзнак ведання сапраўднага жыцця савецкай моладзі. Маладыя будаўнікі вырашылі паехаць усёй брыгадай на адну з буйнейшых будоўляў Сібіры. Але адзін з іх ажаніўся і застаўся ў Мінску. Па настаянню брыгады кіраўніцтва прадпрыемства выдзеліла яму кватэру. Павінна адбыцца наваселле, але маладажоны перадумалі, свой ордэр на кватэру аддалі прыбіральшчыцы інтэрната, а самі разам з брыгадай паехалі на будаўніцтва.

Асноўныя драматургічныя элементы ў навеле нібы ў наяўнасці: ёсць завязка дзеяння, кульмінацыя, развязка і г. д. Але няма праўдзівага жыццёвага канфлікту, паўнакроўных характараў маладых будаўнікоў, нашых сучаснікаў. А між тым, у матэрыяле навелы былі прадпасылкі для цікавых мастацкіх рашэнняў. Дастаткова хоць бы прыгадаць сустрэчу маладажонаў Зіны і Івана. Кожны з іх перадумаў і хоча ехаць са сваімі сябрамі на далёкую будоўлю, але, сустрэўшыся, яны доўга гуляюць і баяцца пачаць пра гэта размову, каб не засмуціць адзін аднаго. Гэтая сцэна давала добры іграві матэрыял і для В. Вінаградава (Іван) і для Л. Цімафеевай (Зіна). Але рэжысёр вырашыў яе спрошчана, абмежаваўшыся некалькімі агульнымі планамі, якія нічога не гавораць гледачу, не выкарыстаў псіхалагічных магчымасцей, закладзеных у матэрыяле. Увогуле спрошчанасць ляжыць і на ўсіх астатніх эпізодах навелы. І гэта не выпадкова. Аўтары навелы імкнуліся толькі да таго, каб на экране ўсё было як мага больш «прыгожа». І таму сцэна камсамольскага сходу ў клубе будаўнікоў знята ў глядзельнай зале Тэатра оперы і балета, героі жывуць у пакоях інтэрната, якія нагадваюць нумары «люкс» першакласных гасцініц, а на будоўлю брыгада накіроўваецца з Мінскага аэрапорта ў шматмясцовых паветраных лайнерах.

«Сакратар паваткома». Ганя — арт. В. Лысенка.

«Камбуд». Кадр з фільма.

«Далі клічуць». Кадр з фільма.

Аўтары навелы «Далі клічуць» забылі простую ісціну, што ніякая работа рэжысёра, аператара або артыстаў не зробіць фільм творам мастацтва, калі ў ім няма праўды жыцця. Няўдача навелы наглядна гэта пацвердзіла.

Тым не менш, фільм «Апавяданні аб юнацтве» мае права на жыццё, нягледзячы на ўсе недахопы, бо задача, якая была ў ім пастаўлена, далёка не з лёгкіх. Нават масцітым рэжысёрам і сцэнарыстам такі жанр у кіно далёка не заўсёды ўдаецца. А тут за справу ўзялася моладзь.

В. СМАЛЬ.

З ГІСТОРЫІ НАШАЙ КУЛЬТУРЫ

Біяграфічная недакладнасць

У № 43 газеты «Літаратура і мастацтва» ад 2 чэрвеня 1961 г. надрукавана рэцэнзія А. Мальдзіса на кнігу В. Абалевіча «Гісторыя польскай літаратуры». Увогуле гэта нядрэнная рэцэнзія. Яе вартасцю з'яўляюцца шырокая пастаноўка пытання, яснасць і арыгінальнасць разважанняў. Аднак некаторыя палажэнні рэцэнзента выклікаюць пярэчанні.

А. Мальдзіс справядліва крытыкуе нашых літаратуразнаўцаў за слабае знаёмства з літаратурнай скарбніцай польскага народа, але падмацоўвае гэтую крытыку няўдалым прыкладам. З другога боку, гэтаму прыкладу нельга адмовіць у нагляднасці, паколькі, разгортваючы сваю аргументацыю, рэцэнзент сам выяўляе недастатковае веданне некаторых момантаў гісторыі польскай літаратуры і пацвярджае тым самым справядлівасць свайго зыходнага палажэння.

Гаворка ідзе пра крытычную заўвагу А. Мальдзіса ў адрас С. Майхровіча. Бясспрэчна, тыя радкі «Нарысаў беларускай літаратуры XIX ст.», у якіх С. Майхровіч тлумачыць і каменціруе паведамленне «Иллюстрированной газеты» пра Дзяніса Князьніна—«першага беларускага народнага паэта», — не зусім задавальняюць чытача. Калі чытаеш «Нарысы», ствараецца ўражанне, нібы С. Майхровіч ведае толькі пра беларускага паэта Дзяніса Князьніна і нічога не чуў пра польскага паэта Францішка — Дыянізія—Ігнацыя Князьніна. Памылка, больш правільна, «агрэх» С. Майхровіча заключаецца ў тым, што ён нічога не гаворыць пра гэтага апошняга. А. Мальдзіс, крытыкуючы С. Майхровіча, робіць яшчэ большую памылку — ён скажае біяграфію паэта і робіць вельмі паспешлівыя вывады на падставе неправераных даных.

Для таго, каб атрымаць уяўленне аб жыццёвым шляху і творчасці Ф.-Д. Князьніна, рэцэнзент рэкамендуе такі спосаб: «дастаткова было ўзяць збор твораў Князьніна, выдадзены ў Варшаве ў 1828 г.»! Між тым, справа абстаіць куды прасцей. Зусім не абавязкова для першага знаёмства з паэтам (імя гэта мае на ўвазе рэцэнзент) залазіць у такія бібліяграфічныя нетры, куды больш зручна выкарыстаць апошняе выданне яго твораў, выпушчанае ў 1948 г. у Враславе. Гэта невялікі томік вершаў з вядомай серыі «Biblioteka narodowa». Зборнік суправаджаецца ўступным артыкулам прафесара Варшаўскага універсітэта В. Баравога, у якім падводзяцца вынікі амаль 150-гадовай працы польскіх літаратуразнаўцаў па вывучэнню жыцця і творчасці Князьніна.

А. Мальдзіс мяркуе, што паэт нарадзіўся на Смаленшчыне, дзіцячыя гады правёў у Варшаве і да Беларусі, значыць, ніякага дачынення не меў. Гэта, зразумела, дае яму падставу недаверліва адносіцца да паведамлення «Иллюстрированной газеты». Другую карціну малюе В. Баравы. Князьнін быў выхадцам з беларускай шляхты (на гэта ўказвае нават прозвішча, якое паходзіць, несумненна, ад усходнеславянскага кораня); знаходзіўся ў далёкім сваяцтве з вядомым рускім пісьменнікам, сваім сучаснікам Я. Княжніным; нарадзіўся ў Віцебску, дзе і жыў да 23-гадовага ўзросту. У сваіх вершах ён услаўляў Дзвіну («якая з мачтамі, пянькой і жытам, мінаючы высокія берагі, шчодрым рэчышчам зліваеш ў Балтыку растопленыя ільды і снягі»), успамінаў, што імянна тут, на берагах Дзвіны і Віцьбы, ён спазнаў упершыню радасць творчасці. Як бачым, даныя, якія прыводзяцца В. Баравым, калі не пацвярджаюць проста, дык ва ўсякім выпадку і не пярэчаць таму, што мы можам прачытаць у «Иллюстрированной газете» і ў С. Майхровіча. Разам з тым гэтыя даныя яўна разыходзяцца са звесткамі, што прыводзяцца ў рэцэнзіі А. Мальдзіса.

Давайце паспрабуем уявіць сабе эпоху, у якую жыў Князьнін. Сярэдзіна XVIII ст. Беларуская мова, якая гучала калісьці ў сем'ях і пры дварах еўрапейскіх гасудароў, мова раскошных пергаментаў і праслаўленых выданняў Скарыны, адступае паступова ў глухія шляхецкія ваколіцы, хаваецца пад нізкімі скляпеннямі жытла сялян і рамеснікаў. Але яе ведаюць і ў памешчыцкіх сем'ях, праўда па-панску трэціруючы. Нам невядома, у якой ступені была паланізавана сям'я Князьніна, аднак наўрад ці можна сумняваецца ў тым, што беларуская мова была для Князьніна, прынамсі, не менш блізкай, чым польская. Вельмі нават магчыма, што паэт пісаў і па-беларуску. Таму, магчыма, апроч польскага паэта Францішка-Дыянізія, існаваў яшчэ беларускі паэт Дзяніс. Ва ўсякім выпадку сцвярджэнне рэцэнзента, што «да гісторыі беларускай літаратуры Князьнін не мае дачынення», уяўляецца нам рызыкоўным. І калі нават Князьнін і не пісаў па-беларуску, усё роўна гэта занадта катэгарычны тэзіс, паколькі біяграфія паэта з'яўляецца яркім сведчаннем таго, у якіх умовах развівалася беларуская літаратура ў XVIII ст. А хіба не цікава з пункту погляду гісторыі беларускай літаратуры, гісторыі культуры Беларусі ведаць, што ў 60—70 гадах XVIII ст. па віцебскіх вуліцах хадзіў юнак, які перакладаў Гарацыя і ствараў лацінскія оды, якія, дарэчы сказаць, могуць разглядацца ў гісторыі беларускай літаратуры на той жа падставе, на якой яны разглядаюцца ў польскай. Праўда, юнак гэты быў апрануты ў адзенне паслушніка ордэна езуітаў. І тут, магчыма, мы падыходзім да прычыны таго, чаму мы не ведаем цяпер беларускага паэта Дзяніса Князьніна. Калі хлопчыку было 8 год, памёр бацька. У адзінаццаць год ён быў аддадзены ў Віцебскую езуіцкую калегію (школу), праз тры гады стаў паслушнікам. Словы «езуіт», «езуітызм» выклікаюць у нас пагарду. І, напэўна, не мы ў гэтым вінаваты. Расказ пра лёс Князьніна павінен быць расказам пра адно са шматлікіх злачынстваў езуітаў. Свае чорныя справы езуіцкія калегіі ў Беларусі (а іх было ў той перыяд нямала) прыкрывалі шырмай культурніцкай дзейнасці. Але ўзамен яны патрабавалі вельмі многага—адмаўлення ад уласнай культуры, ад свайго народа. У пастку да езуітаў трапіў і таленавіты юнак з Віцебска. І не стала Дзяніса Князьніна. Засталася, як вестачка невядомай трагедыі, толькі скарга, плач адзінокай душы ў вершах на польскай мове, дзе паэт называў сябе «więzień spętany» — «скаваны вязень».

З езуіцкай калегіі ён выйшаў з надламанай душой. За 11 год да смерці Князьнін страціў розум і апошнія гады жыцця правёў у цяжкім вар'яцтве.

Яшчэ адна маленькая заўвага. Палемізуючы з В. Абалевічам, А. Мальдзіс называе вядомага польска-беларускага паэта XIX ст. В. Сыракомлю «паслядоўным сялянскім дэмакратам». Гэта, на мой погляд, няправільна. Сыракомлю нельга назваць нават проста сялянскім дэмакратам, а слова «паслядоўны» вырвалася ў рэцэнзента ўжо яўна ў палемічным запале. Сялянскі дэмакрат — гэта выказнік сялянскіх інтарэсаў, прыхільнік сялянскай вайны супраць памешчыкаў. Выдатны ўзор, эталон паслядоўнага сялянскага дэмакрата ў Беларусі — К. Каліноўскі. Сыракомля быў, зразумела, чалавекам іншага тыпу. Па сваіх сацыяльна-палітычных поглядах ён стаяў бліжэй да В. Дуніна-Марцінкевіча (хоць быў, бадай, некалькі больш левым), чым да К. Каліноўскага. Ён з'яўляўся выказнікам імкненняў лепшай часткі шляхты, той яе часткі, якая яшчэ не адарвалася ад народа. В. Абалевіч зусім правільна адносіць В. Сыракомлю да шляхецкіх дэмакратаў.

Г. КІСЯЛЕЎ.

Падзеі, факты, навіны

ЦЫКЛ СПРАВАЗДАЧНЫХ КАНЦЭРТАЎ

Мінскае абласное ўпраўленне культуры, абласны Савет прафсаюзаў і Дом народнай творчасці праводзяць цыкл справаздачных канцэртаў мастацкай самадзейнасці раёнаў вобласці, прысвечаных XXII з'езду партыі.

У мінулую нядзелю ў Палацы культуры прафсаюзаў з творчай справаздачай выступілі самадзейныя калектывы і індывідуальныя выканаўцы Слуцкага раёна. Перад пачаткам канцэрта сакратар райкома партыі тав. Лятковскі коратка расказаў аб тым, як працоўныя Случчыны змагаюцца за датэрміновае выкананне планаў трэцяга года сямігодкі, рыхтуючыся дастойна сустрэць з'езд партыі. Ад імя музычнай грамадскасці беларускай сталіцы самадзейных артыстаў вітаў мастацкі кіраўнік Акадэмічнай харавой капэлы народны артыст СССР Р. Шырма.

У канцэрце прынялі ўдзел харавыя калектывы калгасаў імя Кірава і «Прамень камуны», артысты-аматары гарадскога Дома культуры, а таксама некалькі навучэнцаў Слуцкай музычнай школы.

У гэтым жа месяцы мінчане пазнаёмяцца з творчасцю мастацкай самадзейнасці Вілейскага раёна.

КОРАТКА

□ У Масіву выехаў ансамбль танца клуба Мінскага трактарнага завода (мастацкі кіраўнік М. Чысцякоў).

Выступленні самадзейных танцораў адбудуцца на сцэне Крамлёўскага тэатра.

Разам з танцорамі ў канцэртах прымуць удзел цымбалісты і балалаечнікі. Чытальнік Г. Трошын выступіць з чытаннем апавядання лаўрэата Ленінскай прэміі А. Твардоўскага «Вяселле».

□ Беларуская дзяржаўная філармонія наладзіла ў Мінску «Вечары савецкай паэзіі» з удзелам артысткі Кіеўскай філармоніі майстра мастацкага слова Н. Камінскай. Украінская артыстка выступіла перад супрацоўнікамі Будтрэста № 1 і перад школьнікамі горада.

□ Масавая бібліятэка Ленінскага раёна сталіцы і кінатэатр «Мір» наладзілі для гледачоў музычную гутарку, прысвечаную жыццю і творчасці выдатнага рускага кампазітара, аднаго з членаў музычнага гуртка «Магутная кучка» — М. А. Рымскага-Корсакава.

Аб жыццёвым і творчым шляху кампазітара расказала супрацоўнік бібліятэкі Н. Смольская. Артысты філармоніі і Тэатра оперы і балета выканалі арыі і песні з опер М. Рымскага-Корсакава «Царская нявеста» і «Снягурачка», шэраг яго рамансаў.

ГОСЦІ З ЧЭХАСЛАВАКІІ

Некалькі дзён гасцілі ў сталіцы рэспублікі нашы чэхаславацкія сябры — аркестр народных інструментаў радыё Брно.

Гэты таленавіты калектыў вядомы далёка за межамі Чэхаславакіі. За сваю творчую дзейнасць ён узнагароджаны ордэнам ЧССР «За заслугі ў будаўніцтве сацыялізма» і ордэнам «Працы 1-й ступені» В'етнамскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

У час гастролей чэхаславацкія артысты пазнаёмілі мінчан з творамі чэшскіх кампазітараў, выканалі марайскія і славацкія народныя песні і танцы.

Як жаданых гасцей сустрэлі артыстаў на Мінскім камвольным камбінаце. Пасля канцэрта чэхаславацкія сябры шчыра гутарылі з рабочымі, знаёміліся з вытворчасцю камбіната.

На здымку: на камвольным камбінаце. Танцавальная група аркестра выконвае нацыянальны танец.

Фота **Н. РЫЖОВА.**

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

Міністэрства культуры БССР з жалем паведамляе аб смерці былога дырэктара Гомельскага абласнога драматычнага тэатра Мікалая Мікалаевіча Арлоўскага і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 03638

Друкарня імя Сталіна.